

ПА КОНКУРСЕ Ў... СТУДАТРАД **4**

ФАЙНАЯ СУКЕНКА АД ДЫЗАЙНЕРА **9**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЖНІЎНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 146 (28762)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй МОЛЧАН, дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Змены ў закон «Аб турызме» ўжо наспелі. Цяперашняя сітуацыя дае дадатковыя аргументы для іх хутчэйшага ўнясення. Абноўленая рэдакцыя закона можа быць падрыхтавана ўжо ў першым паўгоддзі 2019 года. Пра канкрэтныя змяненні, якія ў ёй з'явіцца, пакуль казаць рана, яны яшчэ прапрацоўваюцца. Але сутнасць прапаноў Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі, якія ўнясе іх у Мінспорту, заключаецца ў заканадаўчай дыферэнцыяцыі нацыянальных і замежных тураператараў, заканадаўчым падзеле выязных і ўязных тураператараў, тураператараў і турагенцтваў і абавязковай сертыфікацыі турагенцкай дзейнасці. Акрамя таго, Рэспубліканскі саюз турындустрыі выступіў з падтрымкай ініцыятывы Мінспорту аб аб'яднанні бязвізавых зон Брэсцкай і Гродзенскай абласцей».*



Фота БелТА.

# З КЛОПАТАМ АБ ЧАЛАВЕКУ

## На працу механізатараў у спякоту трэба звярнуць асаблівую ўвагу

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка, наведваючы палі 1-й Мінскай птушкафабрыкі, дзе яму далажылі аб ходзе ўборкі збожжавых у краіне і рэгіёне.**

На думку кіраўніка дзяржавы, у гарачае надвор'е трэба вельмі ўважліва ставіцца да арганізацыі працы людзей. Напрыклад, можна зрабіць перапынак у сярэдзіне дня, аднак больш часу працаваць раніцай і ўвечары, калі ўмовы надвор'я не настолькі складаныя. Беларускі лідар падкрэсліў: трэба паберагчы людзей.

СТАР. 2

# ГАРАДНАЯ — ГАНЧАРНАЯ СТАЛІЦА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У старажытнай палескай вёсцы Гараднай прайшоў кірмаш, на якім галоўным і хадавым таварам быў гліняны посуд, а цэнтральнай фігурай свята стаў... ганчар. У нядзельную раніцу на кірмашовым пляцы сабраліся і маладыя, і ўжо сталыя — вядомыя гаршкалепы і керамісты з Беларусі і нават з-за мяжы. Адным з удзельнікаў гэтага кірмашу быў патомны ганчар з Гараднай Рыгор КАВАЛЬКА (на фота). Сваё ўмельства гэты майстар не толькі ўкладвае ва ўласныя вырабы, але і перадае яго маладому пакаленню гараднянцаў.

СТАР. 13

## КОРАТКА

- **Каманда Узброеных Сіл Беларусі заваявала золата на чэмпіянаце армій дзяржаў — удзельніц СНД па стральбе са штатнай зброі.**



- На Аўгустоўскім канале заўважылі сляды мядзведзя. Высветлілася, што госць з'явіўся з Польшчы. Ён прайшоўся па лесе, пабываў у раёне вёсак Кадыш і Галавенчыцы і праз суткі сышоў назад.
- **Электраматацыклы і электраквадрацыклы распрацоўваюцца ў Беларусі.**
- Еўракамісія экстранна выдзеліць Іспаніі 20 млн еўра на вырашэнне праблемы мігрантаў.

■ Вандроўка патрыёта

# ТАЯМНІЦЫ МІЖРЭЧЧА

## Карэспандэнт «Звязды» даведалася, дзе знаходзіцца цудадзейная ікона, ці памятаюць на радзіме пра легендарнага разведчыка Льва Маневіча і колькі каштуе мясцовы сэрвіс

**Падарожжа турыста-адзіночкі, якога вабяць родныя мясціны з іх цікавым гістарычным мінулым, працягваюцца. Нагадаем, праект наш прысвечаны Году малой радзімы і яго мэта — звярнуць увагу на тое, якая багатая ў нас спадчына. Вось, напрыклад, што вы ведаеце пра Чавусы? Што гэта сталіца беларускага казацтва? Або што тут пахаваны продкі галівудскіх зорак Керка і Майкла Дугласаў? Ці чулі, што дзесьці тут жылі продкі ізраільскага прэм'ер-міністра Арыэля Шарона? А што калі праверыць гэтую інфармацыю, як той казаў, на месцы? Тым, каму цікава, запрашаю скласці кампанію для вандроўкі ў старадаўні горад на берагах маленькіх, але вельмі маляўнічых рэк — Проні і Басі.**

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

# З КЛОПАТАМ АБ ЧАЛАВЕКУ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Ён таксама звярнуў увагу, што з-за надвор'я ў многіх краінах чакаецца вельмі вялікі недабор збожжа. Складанасці здарыліся ў такіх краінах, як Германія, Польшча, Іспанія і Францыя, а ў Расіі прагназуюць 25 % недабору да леташняга ўзроўню.

«Вядома, і мы нешта страцілі, але не настолькі: нас яшчэ Гасподзь пашкадаваў. Таму трэба мець на ўвазе, што мы асабліва не кінемся дзесьці закупляць хлябы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — На рынку яны будуць. Але, па-першае, будуць у вялікай цане, а па-другое, зразумела, якія мы будзем купляць кармы па якасці. Таму максімум напружання для таго, каб сабраць да зярнятка тое, што мы сёння вырасцілі, і кукурузу».

У Мінскай вобласці збожжавыя і зернебабовыя ўбраныя на 44 % плошчаў, намалочана 640,5 тыс. тон пры ўраджайнасці 30,3 ц/га. Пастаўкі харчовага збожжа на дзяржзаказ выкананы на 40 %. Ужо ўбрана 40 % лёнудаўгунцу. Нарыхтоўка кармоў па ўсіх відах склала 34 % да запланаванага. План па ўборцы рапсу выкананы на 97 %, намалочана 127,8 тыс. тон пры ўраджайнасці 17 ц/га.

Як далажылі Прэзідэнту, па ўсёй Беларусі ўбраны збожжавыя і зернебабовыя на плошчы 894,7 тыс. га, што складае 41,9 % да плана. Намалочана збожжа больш за 2,5 млн тон, сярэдняя ўраджайнасць — 28,8 ц/га. План пастаўкі збожжа на дзяржзаказ выкананы на 28,7 %. Пры плане 859 тыс. тон пастаўлена збожжа 246,2 тыс. тон.

## «НАРОД БУДЗЕ З ХЛЕБАМ» Прэзідэнт адказаў на пытанні

Пасля Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з журналістамі. Цэнтральнай тэмай размовы, зразумела, стала сельская гаспадарка. Спачатку ў беларускага лідара пацікавіліся, як ён ацэньвае ўборачную кампанію, ці будзе народ з хлебам, а таксама як мінімізаваць рызыкі, якія здараюцца з-за ўмоў надвор'я.

«На надвор'е ківаць няма чаго, — адрэзаў кіраўнік дзяржавы. — Надвор'е было нядрэннае. Яно не ідэальнае, вядома, хацелася б, каб вясна была менш засушлівая».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, першы ўкос траў быў добры, паколькі прайшлі дажджы. У краіне нарыхтавалі якасны сянаж з першага ўкосу. «Так, трохі падсушыла. Але ў нас жа заўсёды — то залье, то засушыць. Але сёлета падсушыла моцна і ў той перыяд, калі ішоў наліў збожжа. Гэта дрэнна, — канстатаваў беларускі лідар. — І потым, трэба разумець, я ўжо ўчора казаў падчас размовы са старшынёй аблвыканкама, што надвор'е не ўсюды было такое».

На думку кіраўніка дзяржавы, у многіх раёнах будзе выдатны ўраджай, калі яго своечасова ўбраць. «Гэта будзе наступнай тэмай маіх паездак», — анансаваў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца таго, ці будзе народ з хлебам, тут кіраўнік дзяржавы быў непахісны — праблем няма. «У нас, напэўна, паўтара мільёна запасаў, мы ўвесь час, кожны год абнаўляем. Старое зерне скормліваем, з'ядаем, новае закладваем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Недарэмна мы, напэўна, дзесьці, па маіх разліках, калі ўлічыць кукурузу, паўмільёна тон да ўзроўню мінулага года. Напэўна, гэтага дастаткова для таго, каб забяспечыць вытворчасць малака, мяса, птушкі, яек і іншага».

Наступнае пытанне пачалося са звароту да кіраўніка дзяржавы аб тым, што чуткі з нагоды стану яго здароўя аказаліся моцна перабольшаныя. У адказ Аляксандр Лукашэнка жартаўліва прапанаваў журналістам яго памацаць. «Яшчэ кажуць, што двайнік працуе», — пасмяяўся ён.

Асноўны пасыл чарговага пытання: ці варта ў Беларусі выбраць іншую спецыялізацыю замест сельскай гаспадаркі? Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што адзін аграрый забяспечвае работай сем-восем чалавек. Бо, каб прыгатаваць той жа хлеб, задзейнічана мноства спецыялістаў. На думку беларускага лідара, калі мы гэта спынім, то паўкраіны будзе хадзіць без працы.

«Мы ўжо перакананіся на практыцы, што гэта ў цэлым нам танней абыходзіцца, чым купляць імпартнае малако, мяса», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Далёка па прыклады хадзіць не трэба — узяць тую ж Расію. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што там актыўна ўздымаюць сельскую гаспадарку, хоць краіна валодае велізарнымі рэсурсамі, каб спакойна імпартаваць усё патрэбнае. «Калі ў цябе няма свайго і табе хтосьці пастаўляе, ён у любы момант цябе можа ўзяць за горла. І ўсё — няма незалежнасці, няма суверэнітэту», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар паставіў іншае пытанне: ці трэба Беларусі вырабляць значна больш сельгаспрадукцыі, чым на цяперашні момант? Ён выказаў упэўненасць у тым, што ў перспектыве прадукты харчавання будуць запатрабаваны ўдвая.

«Зараз мы не будзем фарсіраваць гэта, таму што прадаць цяжка. Вы бачыце, як мы прабіваемся на кітайскі рынак, дыверсіфікуем продаж харчавання па ўсім свеце, каб не залежаць ад аднаго расійскага рынку. Мы ідзём ва ўсе кропкі для таго, каб прадаць тое, што мы сёння вырабляем з лішкам», — даў адказ Прэзідэнт.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Дзяржаўны інтарэс

# Прэстыж неабходна павышаць

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава сустрэлася з прадстаўнікамі спецыяльнай групы рэзерву кіруючых кадраў ад Брэсцкай вобласці. Падчас размовы бакі абмеркавалі, якімі павінны быць дзяржслужачыя.**

Прапановы па павышэнні прэстыжу дзяржслужбы былі агучаны Прэзідэнту на нарадзе 26 ліпеня. Зараз яны адпрацаваны. «Гаворка перш за ўсё ідзе пра чалавечыя якасці, маральнае аблічча. Гэта асноватворнае. Калі чалавек па сваёй натуры ўмее працаваць з людзьмі, па-добраму да іх ставіцца, то такі дзяржслужачы, несумненна, адбудзецца», — адзначыла Наталля Качанава.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнула ўвагу, што ў нашай краіне аналізуюць работу дзяржслужачых, у тым ліку з улікам замежнага вопыту. Наталля Качанава запрасіла ўдзельнікаў сустрэчы да адкрытай размовы, каб у далейшым прымаць эфектыўныя рашэнні па павышэнні прэстыжу дзяржслужбы.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■


**Открытый аукцион № 54/18 по продаже квартиры по адресу:**
**Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Красноармейская, 6-35**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс: + 375 (17) 256-61-35 | | | | |
| **Аукцион состоится 03.09.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко 35А, пом. 701.** Продавец – ОАО «Ивацевичдрев» | | | | | |
| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи, руб. с НДС | Сумма задатка по лоту, руб. |
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 124/D-4930, назначение – квартира, наименование – однокомнатная квартира | Республика Беларусь, Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Красноармейская, 6-35 | 30,2 | 19 442 руб. 92 коп. | 1 900 руб. |
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия | | | | |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 29.08.2018 до 17.00** | | | | |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 54/18 по лоту № 1» | | | | |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 54/18. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения | | | | |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 20 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:** + 375 (17) 256-61-35, + 375 (25) 549-86-22 – Игорь Садливский, auction@expertiza.by.
Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу http://www.expertiza.by


■ Ва ўрадзе

# Рост апярэдзіў прагноз

Падчас пасяджэння Савета Міністраў адзначылі пазітыўную дынаміку ў апрацоўчай прамысловасці, будаўніцтве, гандлі і сельскай гаспадарцы

**Ва ўрадзе ацанілі вынікі работы эканомікі за першыя паўгода як пазітыўныя. Пры гэтым тэмп росту ВУП апярэджвае прагнозныя паказчыкі. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ на пасяджэнні Савета Міністраў, дзе разглядаліся вынікі дзейнасці за першае паўгоддзе, а таксама меры па выкананні задач на 2018 год. Па яго словах, цяпер выконваюцца ўсе найважнейшыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджаныя кіраўніком краіны.**

### ЭКАНОМІКА ПЛЮСУЕ

Тэмп росту ВУП за першае паўгоддзе склаў 104,5 % (прагноз 102,8 %). Ва ўсіх рэгіёнах адзначаецца рост валавога рэгіянальнага прадукту і прадукцыйнасці працы. Станоўчы вынік і па многіх відах эканамічнай дзейнасці. У апрацоўчай прамысловасці рост склаў 7,9 %, у будаўніцтве — 7,5 %, у гандлі — 7,8 %, у сельскай гаспадарцы — 3,9 %, у транспартнай дзейнасці — 3,7 %. Вытворчасць машын і абсталявання павялічылася на 19,2 %, транспартных сродкаў — на 13,7 %, прадукцыі дрэваапрацоўкі — на 14,8 %, фармацэўтычнай прадукцыі — на 11,9 %.

Захоўваецца баланс у знешнім гандлі. Сальда па таварах і паслугах (за 5 месяцаў) дадатнае — плюс $310 млн, або 1,4 % да ВУП. Прырост атрыманы за кошт росту экспарту тавараў і паслуг, перш за ўсё ў краіны па-за СНД. Усяго экспарт тавараў і паслуг павялічыўся на $3 млрд (плюс $2,4 млрд — па таварах і $0,6 млрд — па паслугах), у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

«Нізкі ўзровень інфляцыі разам з іншымі мерамі макрабалансіроўкі дазваляюць зніжаць кошт крэдытных рэсурсаў для эканомікі. Стабільнасць на валютным, крэдытна-дэпазітным і фінансавым рынках захоўваецца. Давер да нацыянальнай валюты расце», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

На ўнутраным валютным рынку за першае паўгоддзе сфарміравалася станоўчае сальда куплі-продажу валюты ў аб'ёме $320 млн. Насельніцтва на чыстай аснове прадало амаль $800 млн, юрыдычныя асобы набылі $480 млн.

### А ЦЭНЫ?

Падчас пасяджэння прэм'ер-міністр даручыў міністру антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзіміру Калтовічу забяспечыць кантроль і разам з губернатарамі апаратыўна прымаць усе неабходныя меры па стрымліванні неабгрунтаванага росту цэн.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што інфляцыя знаходзіцца на мінімальным узроўні за ўсю гісторыю, і гэта вельмі важны паказчык для забеспячэння макраэканамічнай збалансаванасці. «У насельніцтва аднак фарміруюцца некалькі іншыя ацэнкі на аснове інфляцыйных чаканняў, а «дапамагае» ў гэтым адпаведная інфармацыйная падсілкоўванне», — дадаў Андрэй Кабякоў.

### ЗАРОБКІ СЯРЭДНІЯ І «БЮДЖЭТНЫЯ»

Прэм'ер-міністр адзначыў, што заробкі бюджэтнікаў будуць расці ў межах даручэнняў кіраўніка дзяржавы і магчымасцяў бюджэту.

«Суадносіны заработнай платы бюджэтнікаў да сярэдняй па краіне ўжо складаюць 78,8 %. У чацвёртым квартале гэтага года плануецца выйсці на 80 %», — падкрэсліў кіраўнік урада.

За пяць месяцаў бягучага года рэальныя даходы насельніцтва прырасл на 7,7 %, рэальная заработная плата па паўгоддзі — на 13 %, у тым ліку ў бюджэтнай сферы — на 15,4 %. Сярэдняя заработная плата па краіне за чэрвень склала BYN953,7. У пазабюджэтным сектары эканомікі сярэдні заробак за студзень — чэрвень склаў BYN996,3. «Выяўляецца тэндэнцыі, калі заработная плата на прадпрыемствах расце хутчэй, чым прадукцыйнасць працы. Сітуацыю да канца года трэба выпраўляць», — зрабіў даручэнне прэм'ер-міністр.

### ГАСІЦЬ ДАЎГІ ДЗЯРЖСРОДКАМІ НЕ ВЫЙДЗЕ

«Выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі ў якасці інструменту для развязкі пратэрмінаваных даўгоў катэгарычна непрымальна», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Па яго словах, у корані не правільна тое, што многія дзяржаўныя прадпрыемствы разлічваюць у гэтым пытанні на бюджэт.

Ён падкрэсліў, што неабходныя рынкавыя інструменты для фінансавага аздараўлення прадпрыемстваў ужо створаны. Прыняты Указ № 200 ад 24 мая 2018 года, які дзейнічае ў адносінах да арганізацый як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці. Маецца і магчымасць дыскантавання доўгу, яго замены на акцыі, прыцягнення інвестараў.

«Пакуль няма прыкладаў сярод прыватных і дзяржаўных кампаній, якія гэтымі інструментамі скарысталіся. Трэба больш актыўна займацца, таму што самі гэтыя праблемы не растворацца», — канстатаваў Андрэй Кабякоў.

За пяць месяцаў 2018 года пратэрмінаваная запазычанасць па крэдытах і пазыках у цэлым па краіне павялічылася на 1,7 % і склала BYN2,5 млрд, або 3,6 % ад усёй сумы запазычанасці па крэдытах і пазыках.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

■ Тэхналогіі

# Трапіць у Мінск 1960-х

## ...і нават праехацца па ім на танку

**Беларуская кампанія Wargaming, якая з'яўляецца распрацоўшчыкам сусветна вядомай гульні World of Tanks, прадставіла дапаўненні, якія дапамогуць лепш пазнаць гісторыю нашай сталіцы. Так, у гульні з'явіцца новая лакацыя — Мінск узору 1960—1970-х гадоў, адлюстраваны з фатаграфічнай дакладнасцю.**



Як расказаў **дырэктар па аперыраванні ў СНД кампаніі Wargaming Юрый КУРАВЫ,** спачатку распрацоўшчыкі выбіралі паміж трыма раёнамі: тэрыторыяй каля чыгуначнага вакзала, Траецкім прадмесцем і плошчай Перамогі. У выніку спынілі свой выбар на апошнім варыянце, прычым акцэнт зрабілі на максімальнай гістарычнай дакладнасці. Плошча карты займае каля аднаго квадратнага кіламетра, пры гэтым на ёй можна знайсці мноства знакавых для мінчан месцаў: манумент Перамогі, Дом-музей I з'езда РСДРП, цырк, парк Горкага, тэлевежу і проста пазнавальныя дзякуючы сваёй архітэктуры жылыя дамы.

Ёсць, вядома, невялікія недакладнасці, але яны неабходныя па параметрах гульні: напрыклад, меншы, чым у рэальнасці, нахіл вуліц або больш высокія дрэвы ў скверы, але на агульнае ўспрыманне гэта істотна не ўплывае. Да таго ж на вуліцах горада абсалютна няма людзей: па легендзе яны былі эвакуяваны падчас вучэбнай трывогі. У цэлым — атрымалася выдатная магчымасць на свае вочы ўбачыць Мінск з апавяданняў пісьменнікаў або расказаў бабуль і дзядуляў, а для некаторых — натхніцца на паездку ў беларускую сталіцу.



Як адзначыў **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Павел САПОЦЬКА,** гэты перыяд некаторыя гісторыкі называюць «рэнесансам» Беларусі і непасрэдна Мінска, таму асабліва важна папулярызаваць гэтую частку гісторыка-культурнай спадчыны.

Над стварэннем карты каманда больш чым з 45 чалавек працавала 10 месяцаў, падтрымку ім аказвалі эксперты-гісторыкі. Спецыялістамі была праведзена глыбокая даследчая работа — 95 % аб'ектаў былі адноўлены на аснове гістарычных крыніц спецыяльна для гэтай карты. Распрацоўшчыкі абяцаюць, што праграмай можна будзе скарыстацца бліжэй да святкавання Дня танкіста, які ў Мінску традыцыйна супадае з Днём горада.

Сёлета свята пройдзе ў парку Перамогі 9 верасня. Летась мерапрыемства сабрала больш за сто тысяч удзельнікаў і гледачоў, што перавысіла цікавасць нават да найбольш маштабных гульнявых фэстаў, якія праходзяць у ЗША. Сёлета аматараў «танкаў» чакае самая вялікая гульнявая зона пад адкрытым небам — больш чым на 200 камп'ютараў, мноства актыўнасцяў, вялікі фудкорт, маляўнічы феерверк і выступленні вядомых артыстаў — гуртоў «Бумбокс», IOWA і «Танцы мінус».

**Дар'я КАСКО**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ТРАМП АБВЯСЦІЎ АБ ПАЧАТКУ БУДАЎНІЦТВА СЦЯНЫ НА МЯЖЫ З МЕКСІКАЙ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падчас выступлення перад сваімі прыхільнікамі ў горадзе Тампа (штат Фларыда) заявіў, што будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай ужо пачалося, паведамляюць інфармагенцтвы.

«Мы пачалі будаваць вялікія ўчасткі сцяны», — сказаў Дональд Трамп. Па словах амерыканскага прэзідэнта, у распараджэнні ўладаў ёсць звыш $1,5 млрд, але для завяршэння праекта трэба больш сродкаў. Пры гэтым прэзідэнт ЗША раскрытыкаваў дэмакратаў, якія, паводле яго слоў, дапамагаюць распаўсюджванню злачыннасці, выступаючы за адкрытыя межы.

Раней Дональд Трамп пагражаў спыніць работу амерыканскага ўрада, калі дэмакраты не прагаласуюць за будаўніцтва сцяны, якая мае на мэце абараніць ЗША ад наплыву мігрантаў з поўдня.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД ФРАНЦЫІ АДХІЛІЎ ДЗВЕ РЭЗАЛЮЦЫІ НЕДАВЕРУ ЎРАДУ

Дэпутаты Нацыянальнага сходу Францыі адхілілі ў аўторак другую рэзалюцыю аб недаверы ўраду, з якой выступілі левыя партыі. Пра гэта сведчыць прамая трансляцыя з залы пасяджэння на тэлеканале парламента LCP.

За рэзалюцыю, унесеную французскімі камуністамі, сацыялістамі і рухам «Францыя, якая не падпарадкавалася», было пададзена ўсяго 74 галасы. Гэта значна менш неабходнага парога ў 289 галасоў. Большасць у ніжняй палаце належыць прапрэзідэнцкай фракцыі «Рэспубліка на маршы», якая была рашуча супраць дэмаршу апазіцыі.

Рэзалюцыя выносілася на галасаванне ў сувязі з незадаволенасцю апазіцыі дзеяннямі ўладаў у рамках «справы Аляксандра Беналя» — супрацоўніка прэзідэнцкай адміністрацыі, які збіў маніфестанта на першамайскай дэманстрацыі.

Раней за аналагічную рэзалюцыю, унесеную партыяй «Рэспубліканцы», было пададзена 143 галасы — удвая менш, чым патрабавалася для яе адабрэння.

### У МЕКСІЦЫ САМАЛЁТ З СОТНЯЙ ЛЮДЗЕЙ УПАЎ ПРЫ ЎЗЛЁЦЕ: НІХТО НЕ ЗАГІНУЎ



У мексіканскім штаце Дуранга разбіўся самалёт кампаніі Aeromexico — па шчаслівай выпадковасці ніхто з пасажыраў і членаў экіпажа не загінуў, паведамляе El Universal.

Самалёт Embraer 190, які накіроўваўся ў Мехіка, пачаў узлёт каля 15.30 па мясцовым часе ў аўторак, 31 ліпеня. З-за парыву ветру паветранае судна раптам страціла вышыню і зачапіла зямлю левым крылом. Гэта і прывяло да крушэння самалёта, паведаміў губернатар Дуранга Хасэ Росас Аўіспура. Зрэшты, гэта папярэдня звесткі пра прычыну аварыі.

На борце рэйса АМ2431 знаходзіліся 103 чалавекі, у тым ліку двое дзяцей і чатыры члены экіпажа. Нягледзячы на пажар, пасажырам і членам каманды ўдалося хутка сарыентавацца і выратавацца.

У выніку здарэння пацярпелі 85 чалавек, але большасць з іх пакінулі шпіталь адразу пасля агляду. Сур'ёзна пацярпелі толькі некалькі чалавек, сярод іх — пілот самалёта.

■ Крымінал, здарэнні

# З ВАДЫ ДЫ ПОЛЫМЯ

## Выратавалі неабыякавыя грамадзяне людзей, што трапілі ў бяду

**Работнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у вольны ад нясення службы час выратаваў на вадаёме ў Клімавічах васьмікласніцу і яе маці, паведамілі на афіцыйным сайце МНС.**

Гэты выпадак адбыўся каля чатырох гадзін дня. «Капітан унутранай службы Максім Новікаў адпачываў на вадаёме ў Клімавічах. Раптам ён заўважыў, як дзяўчынка і яе маці пачалі тануць за 10 метраў ад берага: дачка павісла ў маці на плячах і яны абедзве апускаліся пад ваду, — паведамляецца на сайце МНС. — Ратавальнік імгненна адрэагаваў і кінуўся ім на дапамогу. Дзяўчынка не адпускала маму, Максім падплыў да іх, нырнуў у ваду, прыўзняў іх і выцягнуў на бяспечную глыбіню, а затым — на бераг».

А вось у Глыбокім мужчына вынес пенсіянера з дома, які палаў, паведаміла Віцебскае абласное ўпраўленне МНС. Мужчына працуе дыспетчарам Глыбоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. У момант пажару ён знаходзіўся ў гаражы насупраць. Убачыўшы дым з-пад даху аднапавярховага дома, выклікаў падраздзяленні МНС. Да прыбыцця ратавальнікаў, падумаўшы, што ўнутры можа хтосьці знаходзіцца, мужчына разбіў вокны, залез у дом і выцягнуў пенсіянера 1957 года нараджэння, які ляжаў на падлозе ў непрытомным стане. Пасля агляду ўрачамі хуткай дапамогі пацярпелы быў шпіталізаваны.

Ратавальнікі ліквідавалі пажар. Агонь у адной з дзвюх кватэр дома пашкодзіў столевае перакрыццё, сцены і маёмасць. Прычына ўзгарання высвятляецца. Разгляданая версія — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

## Украў... дарожны каток

**На такі ўчынак пайшоў жыхар Лепельскага раёна. Дзеля чаго яму спатрэбілася гэтая тэхніка? Для ўласных гаспадарчых патрэб, растлумачыў мужчына.**

Па інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама, паведамленне пра тое, што ўкрадзены каток, паступіла ў міліцыю ад маці праваапарушальніка: дарожная тэхніка затрымалася на ўездзе ў двор. Праваахоўнікі ўстанавілі, што 58-гадовы мужчына, раней неаднаразова судзімы, у тым ліку за крадзяжы, пранік у дарожны каток ДК-47Б, які стаяў на ўчастку аўтадарогі Вялікі Поўсвіж — Чарнаручча, здолеў завесці яго і праехаць каля 500 метраў да свайго дома, размешчанага ў вёсцы Малы Поўсвіж. Мужчына знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення (больш за 1 праміле). Свой учынак міліцыянерам ён растлумачыў жаданнем разраўнаваць і ўтрамбаваць пясок на ўездзе ў двор.

Гэта ўжо другі выпадак, калі ў прадпрыемства, якое абслугоўвае дарогі ў рэгіёне, зганяюць тэхніку. Два месяцы таму быў сагнаны трактар МТЗ-80. Яго пасля знайшлі за 30 кіламетраў ад месца здзяйснення злачынства. Падазраванага ў згоне затрымалі супрацоўнікі Чашніцкага РАУС. Як высветлілася пазней, 60-гадовы рэцыдывіст, які мае за плячыма каля 40 гадоў турэмнага стажу, паспеў адзначыцца крадзяжамі і ў суседніх раёнах.

## У сталіцы лопнула апора моста

**Рух на ўчастку МКАД ускладнены з-за правалу праезнай часткі.**

Па інфармацыі УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, інцыдэнт адбыўся ў раёне перасячэння Ігуменскага тракту з кальцавой. Правал праезнай часткі дарогі ўтварыўся ў трэцяй паласе руху. Меркавана, лопнула апора моста. На цяперашні момант ускладнены рух транспарту па МКАД на ўнутраным кальцы, з боку вуліцы Чыжэўскіх у напрамку вуліцы Кіжаватава. Дзяржаўтаінспекцыя звяртае ўвагу кіроўцаў на тое, што ў сувязі з рамонтнымі работамі з-за прасядання асфальтавага пакрыцця на ўнутраным кальцы МКАД будзе закрыты рух транспарту ў раёне перасячэння Ігуменскага тракту і кальцавой — па пуцеправодзе і пад ім. ДАІ просіць улічваць гэтую інфармацыю пры выбары маршруту руху.

## У Мухаўцы загінула рыба

**Факт забруджвання ракі Мухавец паблізу Пружан зафіксавалі супрацоўнікі Кобрынскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Інфармацыя пра надзвычайнае здарэнне паступіла на тэлефон даверу Дзяржінспекцыі ад мясцовага рыбака.**

У ходзе праведзенага расследавання была вызначана меркаваная крыніца забруджвання. Паводле папярэдніх звестак, у раку трапілі сцёкі арганікі з малочнатаварнага комплексу, размешчанага за сем кіламетраў ад горада. З-за моцнага ліўня пад агарожай фермы ўтварыліся праміоны, праз іх арганічныя адходы сцяклі ў меліярацыйную сетку і далей у канал Вец, які ўпадае ў Мухавец.

У канале і рацэ дзяржінспектары сабралі загінулую рыбу, супрацоўнікі лабараторыі аналітычнага кантролю ўзялі пробы вады. Пасля атрымання вынікаў аналізаў будзе падлічаны і выстаўлены да пакрыцця прычынены прыродзе ўрон. Сельгаспрадпрыемства сваю віну не адмаўляе.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Трэці семестр

# КУДЫ ЧАРГА? У СТУДАТРАД!

## Трапіць сюды можна толькі па конкурсе

**Яшчэ на пад'ездзе да дзіцячага аздараўленчага лагера «Зарніца» ва Уздзенскім раёне, які належыць прадпрыемству «Інтэграл», можна здагадацца, што насельнікі ўстановы весела бавяць час. Вось купка дзяцей ганяе мяч, побач яшчэ адна пускае па траве рознакаляровыя агеньчыкі з нейкага спецыяльнага прыстасавання. А на сцэне хлопчык спявае. Пад задорную мелодыю ліха танцуюць яго сябры. І пры малых — абавязкова дарослыя. Зразумела, за імі патрэбна пільнае вока.**



### ФАКУЛЬТЭТ ДОБРЫХ СПРАЎ

Першым на тэрыторыі лагера мы сустракаем Аляксандра Грыгор'ева.

— Дзеці нас называюць важатымі, як у добрыя савецкія часы, але афіцыйна мы лічымся выхавацелямі, — кажа новы знаёмы. — Лагер працуе па сістэме «Універсітэт — за здаровы лад жыцця». Таму атрады называюцца факультэтамі. Наш, напрыклад, — «Факультэт добрых спраў».

Хлопец вучыцца ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, а ў летні час вырашыў папрацаваць у педагагічным атрадзе імя маршала авіяцыі Аўдзеева.

— Цяпер не так проста трапіць у студэнцкі атрад: вялікі конкурс, — сцвярджае юнак. — Выбіраюць найлепшых. Я вельмі задаволены, што трапіў менавіта сюды. Відаць, узялі мяне, дзякуючы вопыту, які атрымаў раней, калі працаваў у сэрвісным атрадзе ў папярэднія гады. У маёй групе падлеткі чатырнаццаці гадоў, дзеці з розных сем'яў, у тым ліку з няпоўных, прыёмных, апякунскіх, неўладкаваных. Раніцай буджу выхаванцаў, сачу, каб прывялі сябе ў належны выгляд, памыліся, паелі, весела і змястоўна адпачывалі, удзельнічалі ва ўсіх мерапрыемствах, акцыях, што праводзяцца ў лагеры.

— Чаму вырашыў працаваць, а не адпачываць? — пацікавілася ў Аляксандра.

— Работа ў лагеры — адно задавальненне, той жа адпачынак, — усміхаецца мой суразмоўнік. — Так, бывае цяжка, дзесьці не дасплю, не хапае часу на сябе. Але настрой маіх падапечных, удзячнасць іх бацькоў — для мяне шмат значаць.

Ды і матэрыяльны бок справы адыгрывае не апошнюю ролю. Заробленых грошай хопіць надоўга, прызнаецца хлопец. Акрамя таго, некаторыя студэнты здымаюць кватэры ў Мінску. Для іх гэтыя заробкі — добрая нагода наперад аплаціць арэнду. А тут можна сэканоміць і на пражыванні, і на харчаванні — яно трохразовае. Для персаналу і дзяцей створаны выдатныя ўмовы: гарачая вада, электрычнасць, санвузел, сталовая, гульнявыя пляцоўкі.

— Але ж гэта вялікая адказнасць, не страшна? — дапытваюся ў дваццацігадовага выхавацеля.

— У Акадэміі я адказваю за сто чалавек асабовага складу. Так што дысцыпліну трымаць умею, — упэўнена адказвае Аляксандр.

Яўгенія Стасюн таксама вучыцца ў той жа ўстанове, у дзяўчыны не менш адказная пасада — камандзір сэрвісната атрада. Яе падначаленыя наводзяць чысціню ў службовых, спальных памяшканнях, на тэрыторыі лагера. У «Зарніцы» дзяўчына не першы год.

— Мне тут надта падабаецца. У нас сяброўская атмасфера, жывём адной дружнай сям'ёй, — сцвярджае яна. — Кожны раз я вяртаюся дадому з пазітыўнымі эмоцыямі.

— Мы два гады працуем з Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам і два гады — з Акадэміяй авіяцыі, — уступае ў размову **начальнік лагера Таццяна ЯРМАЛІНСКАЯ**. — І, вядома, выбіраем самых актыўных, пазітыўных, працаздольных юнакоў і дзяўчат. Наш лагер круглагадовы. Гэта значыць, неабходны вытрымка і фізічная загартоўка, а таксама адказныя адносіны да сваіх абавязкаў. Бо самае галоўнае для нас — бяспека дзяцей.

### ЗАЛАТЫЯ ХЛОПЧЫКІ

Наступны прыпынак у Слуцкім раёне, у сельскагаспадарчым філіяле «Агра-Замосце» адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў». У навучэнцаў Слуцкага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа работа не з лёгкіх. Яны збіраюць на полі смецце, рэшткі поліэтылену, камяні.

— Наш атрад называецца «Імпульс», у ім дзевятнаццаць хлопцаў, — знаёміць нас камандзір Вадзім Барысавец. — Са Слуцка нас забірае аўтобус, а пасля 14.00 адвозіць дадому. Ёсць у атрадзе і хлопцы, якія жывуць у іншых гарадах, а вучацца ў нашым каледжы. Пасля працы яны жывуць у інтэрнаце, дзе створаны выдатныя ўмовы: кухня, тэлевізары, халадзільнікі. А харчуюцца бясплатна ў сталовай.

Заробленыя грошы юнакі плануюць патраціць на свае патрэбы, хтосьці — на запчасткі для машыны, нехта — на новую вопратку. «Мы ж не мажоры нейкія, каб у бацькоў на шыі сядзець», — жартуюць яны.

— Гэта сапраўды так, хлопцы працавітыя, — пагаджаецца кіраўнік атрада Святлана Клішэвіч.

Святлана Аляксандраўна — майстар вытворчага навучання каледжа. Яна сочыць, каб у атрадзе быў парадак, дысцыпліна, бо менавіта яна нясе непасрэдную адказнасць за кожнага падапечнага.

— У нас з хлопцамі цудоўнае ўзаемапаразуменне. Пасалі нас прапалоць сянажныя траншэі, дык яны так пастараліся, што ніводнай травінкі не пакінулі. Я заўсёды кажу ім, што яны ў мяне залатыя хлопчыкі. Дзецям заўсёды неабходны пазітыў. Добрае слова для іх — стымул імкнуцца працаваць лепш, а значыць, і зарабляць больш.

Заўсёды побач з моладдзю і галоўны аграном гаспадаркі Аляксей Мароз. Пры неабходнасці падкажа, навучыць як і што рабіць.

Не госць у полі і начальнік сельгасфіліяла Ігар Фёдараў.

Заўсёды прыемна назіраць, як працуюць маладыя людзі, лічыць кіраўнік. Для іх гэта — не проста працоўныя будні, але і школа жыцця. А для гаспадаркі, што месціцца ў камяністай мясцовасці, — вялікая дапамога. Тэхніка часта выходзіць са строю. А сёння гарачая пара — жніво, і тут не могуць прыцягнуць сваіх людзей на падсобныя работы.

### ПАСЛЯ ЛАЗНІ — ЛАЗЕРТАГ

Салігорск рыхтуецца з размахам адзначыць 60-годдзе з дня заснавання. Таму тут спяшаюцца да свята ўвесці ў дзеянне новыя гасцініцу, інтэрнат і паліклініку. І на дапамогу своечасова прыйшлі студэнты Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

— Усяго ў нашым атрадзе «Дружба» трыццаць чалавек, размеркавалі па дзесяць на кожны аб'ект. Прыбіраем за будаўнікамі, падносім матэрыялы, размешваем раствор. Словам, выконваем усе даручэнні старэйшых, — расказаў камандзір Аляксей Баравік. Мы — будучыя інжынеры-будаўнікі, і тут для нас вельмі добрая практыка. Трэба ж пачынаць з самай нізкай прыступкі, набірацца вопыту, каб стаць у будучым добрым спецыялістам.

Хлопцаў вельмі гасцінна сустрэлі ў Салігорску, пасялілі ў інтэрнат з усімі бытавымі выгодамі, хтосьці харчуецца ў сталовай непадалёку, нехта гатуе сам.

— Аплата працы ў студэнтаў здзельная, на розных аб'ектах яна адрозніваецца ў залежнасці ад відаў і аб'ёмаў выкананых работ, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара па агульных пытаннях і ідэалагічнай рабоце Салігорскага домабудаўнічага камбіната Вольга ГАНЧАР**. — Напрыклад, на пабудове паліклінікі яны атрымліваюць па 25 рублёў штодзень, інтэрната — больш за 30 рублёў, гасцініцы — каля 40 рублёў.

Хлопцы не толькі добра працуюць, але і адпачываюць. У камбіната ёсць свае Дом культуры, падшэфная школа, ім прапанавалі ўдзельнічаць у мерапрыемствах, што тут ладзяцца, гуляць у спартыўнай зале. Перад нашым ад'ездам студатрадаўцы пасля васьмігадзіннай змены збіраліся ў лазню, якую ім арганізавалі, а затым — памерацца спрытам і сіламі ў турніры па лазертагу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

❍ Каментарый

**Вольга ШЫБКО, загадчык сектара маладзёжнай палітыкі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама:**

— Трэці працоўны семестр у самым разгары. У аблвыканкаме ўжо ўзгоднена 285 студэнцкіх атрадаў агульнай колькасцю 3,3 тысячы чалавек. У тым ліку больш за тысячу маладых людзей працуе і будзе працаваць у дзіцячых аздараўленчых лагерах у складзе педагагічных атрадаў. Запатрабаваны сярод моладзі і сэрвісныя атрады па аказанні паслуг у сферы гандлю, рабоце з персаналам, праца на вытворчасці.

У экалагічных атрадах па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый у Крупках, Жодзіне, у Слуцкім, Чэрвеньскім і Валожынскім раёнах занята каля 150 чалавек.

У сельскагаспадарчыя атрады вобласці плануецца ўладкаваць больш як тысячу навучэнцаў цэнтральнага рэгіёна і студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў сталіцы. Яны разам са школьнікамі будуць дапамагаць аграрыям Міншчыны ва ўборцы ўраджаю, працаваць на мехдварах і зернесушыльных комплексах у разнастайных сельгасарганізацыях і вучэбна-доследных прадпрыемствах. Акрамя таго, будуць дапамагаць збіраць гародніну і садавіну, ягады ў буйных агракамбінатах Міншчыны.

У вобласці ёсць і міжнародныя студатрады. Напрыклад, у атрадзе «Звязда» на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Даўгінава» Вілейскага раёна разам са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта шчыруюць расійскія сябры з Ніжагародскай і Курскай сельгасакадэмій. Сярод шасцідзесяці чалавек — дзве дзяўчыны.

Будаўнічыя атрады ўзводзяць і рэканструююць сацыяльна значныя аб'екты: паліклінікі, дзіцячыя сады і школы ў Салігорску, Фаніпалі, Мар'інай Горцы.

■

■ Прыёмная кампанія — 2018

# СФЕРА ІНТАРЭСАЎ — IT І ПРАВАЗНАЎСТВА

## У ССНУ працягваецца прыём дакументаў на бюджэт

**Кім жадаюць быць выпускнікі беларускіх школ? Падобна на тое, што маладыя беларусы масава вырашылі стаць айцішнікамі. Гэта пацвярджае і прыёмная кампанія ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Усе, хто добра здаў на ЦТ фізіку, выбіраюць спецыяльнасці IT-галіны. Так, у БДУІР — вядучай установе ў краіне па падрыхтоўцы IT-кадраў — сярэдні бал залічаных на бюджэтную форму склаў 339 (у 2017 годзе — 332). А суму балаў не менш як 300 маюць больш за 75 працэнтаў будучых першакурснікаў.**

У топ-5 спецыяльнасцяў з самымі высокімі праходнымі баламі сёлета ўвайшлі: «эканоміка электроннага бізнесу» — 384 (паўпрахадны бал — 383); «электронны маркетынг» — 377 (паўпрахадны — 376); «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — 371 (паўпрахадны — 370); «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 370 (паўпрахадны — 369) і «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» — 368.

Без уступных іспытаў у БДУІР залічаны 23 чалавекі, з іх — два лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і 21 пераможца алімпіяд рознага ўзроўню.

Усяго ў 2018 годзе 100 балаў набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні 392 абітурыенты, і 97 чалавек з іх падалі дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. ЦТ па матэматыцы на 100 балаў здалі 155 чалавек у краіне, і амаль палова з іх (67 абітурыентаў) абралі месцам свайго будучага навучання БДУІР. Ва ўніверсітэт таксама заявілі свае дакументы пяць стабальнікаў ЦТ па фізіцы, 17 — па рускай і беларускай мовах і восем чалавек, якія маюць стабальныя сертыфікаты па англійскай і нямецкай мовах. Сярод выбітных абітурыентаў гэтага года 16 чалавек атрымалі найвышэйшы бал па двух прадметах, і шэсць з іх залічаны на топавыя спецыяльнасці ў БДУІР.

Да 4 жніўня ва ўніверсітэце працягваецца прыём дакументаў на платную форму навучання, але ўжо сёння тут склаўся конкурс амаль на ўсе топавыя спецыяльнасці, якія карысталіся ў абітурыентаў попытам пры паступленні на бюджэт.

А 20 ліпеня распачалася прыёмная кампанія ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. І абітурыенты масава пайшлі падаваць свае дакументы ў Мінскі радыётэхнічны каледж — філіял БДУІР. І зноўтакі на IT-спецыяльнасці. Так, на аснове базавай адукацыі пры паступленні на спецыяльнасць «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» папярэдні прахадны бал на сённяшні дзень складае 9,8 (паўпрахадны 9,7); на спецыяльнасці «праграмуемыя мабільныя сістэмы» папярэдні прахадны бал 9,5 (паўпрахадны 9,4), «электронныя вылічальныя сродкі» — 9,0 (паўпрахадны — 8,9). Нагадаем, што абітурыенты, якія падаюць свае дакументы ў ССНУ пасля заканчэння базавай школы, паступаюць па сярэднім бале дакумента аб адукацыі.

На падставе агульнай сярэдняй адукацыі на спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» у каледжы прадугледжана 25 бюджэтных месцаў, на якія ўжо прэтэндуюць 44 чалавекі.

Масавае жаданне маладых людзей стаць айцішнікамі можна было б ухваліць, але не зусім зразумела, хто ж будзе будаваць масты і дарогі, абслугоўваць атамную электрастанцыю і, у рэшце рэшт, вучыць новыя пакаленні беларусаў фізіцы, без якой будучыня IT выглядае даволі цьмяна.

Таксама нельга назваць нечаканым і вялікі інтарэс моладзі да юрыспрудэнцыі. Так, у Юрыдычным каледжы БДУ на спецыяльнасці «правазнаўства» на аснове базавай адукацыі на 25 месцаў ужо пададзена 138 заяў, прычым 69 абітурыентаў маюць сярэдні бал атэстата ад 9 да 10 балаў.

Прыём на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляюць сёлета па краіне 111 каледжаў, у тым ліку 10 прыватнай формы ўласнасці, а таксама 86 устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Усяго плануецца прыняць 39,3 тысячы чалавек, з іх 24,5 тысячы чалавек — за кошт сродкаў бюджэту.

***Прыём дакументаў на аснове агульнай базавай адукацыі будзе ажыццяўляцца ў ССНУ на бюджэтныя месцы да 3 жніўня, на платнай аснове — да 14 жніўня (калі не прадугледжаны ўступныя іспыты).***

***На аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі дакументы на бюджэт падаюцца да 9 жніўня, на платную форму навучання — да 16 жніўня.***

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЯКАСЦІ І БЯСПЕЦЫ ХАРЧОВАЙ СЫРАВІНЫ І ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ ЧАЛАВЕКА»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 7 чэрвеня 2018 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2018 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2003 года «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 79, 2/966; 2004 г., № 111, 2/1051; 2006 г., № 122, 2/1259; 2007 г., № 170, 2/1344; 2008 г., № 133, 2/1440; 2012 г., № 8, 2/1892; Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.01.2014, 2/2128) змяненні і дапаўненні, выклаўшы яго ў новай рэдакцыі:

## «ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### АБ ЯКАСЦІ І БЯСПЕЦЫ ХАРЧОВАЙ СЫРАВІНЫ І ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ ЧАЛАВЕКА

Гэты Закон накіраваны на ўдасканаленне прававых, арганізацыйных і эканамічных асноў дзяржаўнага рэгулявання ў галіне забеспячэння якасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў і іх бяспекі для жыцця і здароўя чалавека (далей, калі не пазначана іншае, — забеспячэнне якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў).

**Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні**

Для мэт гэтага Закона выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

— бяспека харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — стан харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, які сведчыць пра адсутнасць недапушчальнай рызыкі, звязанай са шкодным уздзеяннем на чалавека і яго будучыя пакаленні, пры іх выкарыстанні ва ўмовах, якія рэкамендаваны;

— біялагічна актыўныя дабаўкі да ежы — прыродныя, ідэнтычныя прыродным харчовыя і (або) біялагічна актыўныя рэчывы, а таксама прабіятычныя мікраарганізмы, прызначаныя для непасрэднага ўжывання чалавекам або ўвядзення ў склад харчовых прадуктаў у мэтах узбагачэння яго рацыёну харчавання, якія не з'яўляюцца адзінай крыніцай ежы;

— вытворца — юрыдычная асоба незалежна ад яго арганізацыйна-прававой формы, індывідуальны прадпрымальнік, якія ажыццяўляюць ад свайго імя вытворчасць харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для рэалізацыі набытчыкам (спажыўцам) і якія нясуць адказнасць за адпаведнасць гэтых харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў устаноўленым патрабаванням да іх якасці і бяспекі;

— якасць харчовых прадуктаў — сукупнасць уласцівасцей і характарыстык харчовых прадуктаў, якія абумоўліваюць іх здольнасць задавальняць фізіялагічныя патрэбы чалавека ў ежы пры звычайных умовах выкарыстання, адпаведнасць гэтых уласцівасцей і характарыстык абавязковым для выканання патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, і (або) дакументам вытворцы, і (або) грамадзянска-прававым дагаворам, заключаным вытворцам, і (або) патрабаванням, пра выкананне якіх вытворца ў добраахвотным парадку заявіў іншым спосабам, а ў дачыненні да біялагічна актыўных дабавак да ежы — таксама сукупнасць уласцівасцей, якія забяспечваюць эфектыўнасць біялагічна актыўных дабавак да ежы пры ўмове іх выкарыстання ў мэтах, для якіх яны прызначаны;

— якасць харчовай сыравіны — сукупнасць уласцівасцяў і характарыстык харчовай сыравіны, якія вызначаюць яго прыдатнасць для выкарыстання ў мэтах, для якіх яна прызначана, адпаведнасць гэтых уласцівасцяў і характарыстык абавязковым для выканання патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, і (або) дакументам вытворцы, і (або) грамадзянска-прававым дагаворам, якія заключаны вытворцам, і (або) патрабаванням, пра выкананне якіх вытворца ў добраахвотным парадку заявіў іншым спосабам;

— крытычная кантрольная кропка — этап вытворчасці, перапрацоўкі (апрацоўкі), рэалізацыі, захоўвання, транспартавання харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, на якім могуць быць ужытыя метады вытворчага, у тым ліку лабараторнага або іншага, кантролю і прыняты меры па забеспячэнні бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека;

— матэрыялы і вырабы, што кантактуюць з харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі (далей, калі не пазначана іншае, — матэрыялы і вырабы), — матэрыялы і вырабы, якія, не з'яўляючыся кампанентамі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, прымяняюцца для вытворчасці, упакоўвання, рэалізацыі, захоўвання, транспартавання харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў і іх выкарыстання;

— абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — распрацоўка харчовых прадуктаў, перапрацоўка (апрацоўка), рэалізацыя, захоўванне, транспартаванне, выкарыстанне, знішчэнне, утылізацыя, увоз у Рэспубліку Беларусь, вываз з Рэспублікі Беларусь харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— партыя харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — пэўная колькасць харчовай сыравіны і харчовых вырабаў аднаго найменя, аднолькава ўпакаваных, выробленых адным вытворцам з адной зыходнай сыравіны і матэрыялаў у адпаведнасці з адным тэхнічным нарматыўным прававым актам у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі і (або) іншымі дакументамі вытворцы ў пэўны прамежак часу, якая суправаджаецца таварасуправаджальнымі дакументамі, якія забяспечваюць нагляд за харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі і пацвярджаюць іх якасць і бяспеку;

— перапрацоўка (апрацоўка) — цеплавая апрацоўка (акрамя замарожвання і ахалоджвання), вэнджанне, кансерваванне, пасяванне, сквашванне, пасол, сушка, марынаванне, канцэнтраванне, экстракцыя, экструзія або спалучэнне гэтых працэсаў;

— харчовая дабаўка — рэчыва, сумесь рэчываў, якія маюць або не маюць уласную харчовую каштоўнасць, звычайна не ўжываюцца чалавекам непасрэдна ў ежу, наўмысна ўводзяцца ў харчовую сыравіну і харчовыя прадукты з тэхналагічнай мэтай і (або) функцыяй пры іх вытворчасці, захоўванні і транспартаванні, што прыводзіць або можа прывесці да таго, што гэтыя рэчывы, сумесь рэчываў або прадукты іх узаемадзеяння з іншымі рэчывамі становяцца кампанентамі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— харчовая каштоўнасць харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — комплекс уласцівасцяў харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, што забяспечваюць фізіялагічныя патрэбы чалавека ў неабходных рэчывах і энергіі;

— харчовыя прадукты — прадукты жывёльнага, расліннага, мікрабіялагічнага, мінеральнага, штучнага або біятэхналагічнага паходжання ў натуральным, перапрацаваным (апрацаваным) выглядзе, якія прызначаны для ўжывання чалавекам у ежу, у тым ліку спецыялізаваныя харчовыя прадукты, пітная вада, расфасаваная ў ёмістасці, пітная мінеральная вада, безалкагольныя напоі, біялагічна актыўныя дабаўкі да ежы, алкагольная прадукцыя;

— прыдуманая (арыгінальная) назва харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — слова або словазлучэнне, якія могуць дапаўняць найменне харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў. Такая назва можа не адлюстроўваць іх спажывецкіх уласцівасцяў і не павінна замяняць найменне харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— харчовая сыравіна — прадукты жывёльнага, расліннага, мікрабіялагічнага, мінеральнага, штучнага або біятэхналагічнага паходжання, а таксама пітная вада, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці харчовых прадуктаў;

— вытворчасць харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — сукупнасць або спалучэнне этапаў тэхналагічнага працэсу стварэння харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, якія паслядоўна выконваюцца для іх рэалізацыі;

— нагляд за харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі — магчымасць дакументарна (на папяровых і (або) электронных носьбітах) устанавіць вытворцу і наступных уласнікаў, якія знаходзяцца ў абароце харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, акрамя канчатковага спажыўца, а таксама месца паходжання (вытворчасці) харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— распрацоўка харчовых прадуктаў — стварэнне ўзораў і (або) нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, неабходных для арганізацыі вытворчасці харчовых прадуктаў;

— рэалізацыя харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — продаж і іншыя спосабы адчужэння харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— спецыялізаваныя харчовыя прадукты — прызначаныя для мэт бяспечнага ўжывання асобнымі катэгорыямі спажыўцоў харчовыя прадукты, для якіх устаноўлены патрабаванні да колькасці і (або) суадносін асобных рэчываў альбо ўсіх рэчываў і кампанентаў, і (або) якіх змененая колькасць і (або) суадносіны асобных рэчываў адносна натуральнай іх колькасці ў такіх харчовых прадуктах, і (або) у склад якіх уключаны рэчывы альбо кампаненты (акрамя харчовых дабавак і араматызатараў), якія не прысутнічалі першапачаткова і (або) у дачыненні да якіх вытворца заяўляе пра іх лячэбныя, дыетычныя і (або) прафілактычныя ўласцівасці;

— тэрмін прыдатнасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў — перыяд часу, на працягу якога харчовая сыравіна і харчовыя прадукты павінны цалкам адпавядаць патрабаванням бяспекі, якія прад'яўляюцца да іх, і ўстаноўленыя актамі заканадаўства, тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама захоўваць свае спажывецкія ўласцівасці, заяўленыя ў маркіроўцы, і па заканчэнні якога яны не прыдатныя для выкарыстання па прызначэнні;

— фальсіфікаваная харчовая сыравіна і харчовыя прадукты — выробленыя і (або) уцягнутыя ў абарот харчовая сыравіна і харчовыя прадукты з наўмысна змененымі складам, і (або) уласцівасцямі, і (або) характарыстыкамі, якія змяняюць іх харчовую каштоўнасць, і (або) наўмысна зменянай інфармацыяй аб складзе і (або) вытворцы, і (або) наўмысна нададзенымі знешнім выглядам і (або) асобнымі ўласцівасцямі пэўнага віду харчовай сыравіны або харчовых прадуктаў, але якія не могуць быць аднесены да харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, за якія яны выдаюцца.

**Артыкул 2. Прававое рэгуляванне адносін у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Адносіны ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў рэгулююцца гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

Адносіны, звязаныя з увозам у Рэспубліку Беларусь і (або) вывазам з Рэспублікі Беларусь харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, рэгулююцца гэтым Законам, заканадаўствам аб знешнеэканамічнай дзейнасці, аб мытным рэгуляванні, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змешчаны ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

Патрабаванні гэтага Закона не перашкаджаюць устанаўленню заканадаўчымі актамі, якія рэгулююць пытанні забеспячэння рэжымаў надзвычайнага або ваеннага становішча, іншых правілаў, чым тыя, якія ўстаноўлены гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў.

**Артыкул 3. Сфера дзеяння гэтага Закона**

Гэты Закон рэгулюе адносіны ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў.

Дзеянне гэтага Закона не распаўсюджваецца на фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі і якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў.

**Артыкул 4. Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Асноўнымі прынцыпамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў з'яўляюцца:

— захаванне роўнасці правоў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў на ажыццяўленне дзейнасці ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— прэзумпцыя добрасумленнасці юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— недапушчальнасць незаконнага ўмяшання дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый у дзейнасць юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— адказнасць дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый за забеспячэнне якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў.

**Артыкул 5. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў вызначае адзіную дзяржаўную палітыку і ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі.

*(Працяг на стар. 6)*

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЯКАСЦІ І БЯСПЕЦЫ ХАРЧОВАЙ СЫРАВІНЫ І ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ ЧАЛАВЕКА»

**Артыкул 6. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў:

— забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

— забяспечвае міжнароднае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь;

— каардынуе дзейнасць падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

— вызначае парадак узаемадзеяння падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, уключаючы ўзаемнае інфармаванне аб выяўленні магчымых рызык неспрыяльнага ўплыву харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў на жыццё і здароўе чалавека, а таксама наступстваў гэтага ўплыву;

— вызначае парадак і ўмовы правядзення юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, кантролю якасці і бяспекі выпрабленых і (або) тых, якія ўвозяцца ў Рэспубліку Беларусь, біялагічна актыўных дабавак да ежы і спецыялізаваных харчовых прадуктаў для харчавання спартсменаў;

— вызначае парадак пацвярджэння юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, звестак аб спецыяльных уласцівасцях (спецыяльныя пажыўныя ўласцівасці, паказанні, супрацьпаказанні да прымянення асобнымі ўзроставымі групамі насельніцтва, а таксама пры асобных відах захворванняў) харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, у тым ліку біялагічна актыўных дабавак да ежы, заяўленых уласцівасцях спецыялізаваных харчовых прадуктаў, якія выносяцца на маркіроўку;

— вызначае з улікам патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншых міжнародна-прававых актаў, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, парадак абароту біялагічна актыўных дабавак да ежы і месцы іх рэалізацыі;

— вызначае з улікам патрабаванняў актаў заканадаўства, тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншых міжнародна-прававых актаў, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, парадак правядзення юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, канфіскацыі, вяртання, знішчэння, утылізацыі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, якія не адпавядаюць устаноўленым патрабаванням да іх якасці і бяспекі;

— ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Другія дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі рэалізуюць адзіную дзяржаўную палітыку ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у межах сваёй кампетэнцыі.

**Артыкул 7. Забеспячэнне якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Якасць і бяспека харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў забяспечваюцца шляхам:

— тэхнічнага нармавання і стандартызацыі ў дачыненні да харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

*(Працяг. Пачатак на стар. 5)*

— устанаўлення санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў да харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, іх вытворчасці і (або) абароту;

— правядзення ветэрынарна-санітарнай экспертызы неперапрацаванай харчовай сыравіны жывёльнага паходжання;

— правядзення дзяржаўнай рэгістрацыі харчовых прадуктаў і вырабаў, якія кантактуюць з харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі, вызначаных тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— правядзення дзяржаўнай санітарна-гігіенічнай экспертызы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, матэрыялаў і вырабаў (за выключэннем тых, якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі);

— ліцэнзавання асобных відаў дзейнасці па вытворчасці і (або) абароце харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— сертыфікацыі або дэкларавання адпаведнасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства, тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— правядзення ў выпадках, устаноўленых актамі заканадаўства, тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, выпрабаванняў харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у выпрабавальных лабараторыях (цэнтрах) па паказчыках бяспекі, а таксама па паказчыках якасці, якія задэклараваны вытворцам;

— выканання юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, патрабаванняў да працэсаў распрацоўкі харчовых прадуктаў, вытворчасці, перапрацоўкі (апрацоўкі), рэалізацыі, захоўвання, транспартавання, выкарыстання, знішчэння, утылізацыі, увозу ў Рэспубліку Беларусь, вывазу з Рэспублікі Беларусь харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, устаноўленых актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— правядзення юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, вытворчага, у тым ліку лабараторнага або іншага, кантролю якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, умоў іх вытворчасці, перапрацоўкі (апрацоўкі), рэалізацыі, захоўвання, транспартавання з улікам вызначэння крытычных кантрольных кропак;

— прыняцця мер па папярэджанні і спыненні парушэнняў заканадаўства ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, а таксама па прыцягненні вінаватых асоб да адказнасці;

— прыняцця іншых мер, накіраваных на забеспячэнне якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў.

**Артыкул 8. Інфармацыя аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Інфармацыя аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў павінна змяшчацца ў суправаджальных дакументах, на ўпакоўцы, этыкетках або даводзіцца да ведама насельніцтва іншым спосабам на беларускай і (або) рускай мовах, калі іншае не прадугледжана тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, і ўключаць:

— найменне харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— звесткі аб вытворцы (назва і месца знаходжання юрыдычнай асобы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) і адрас рэгістрацыі па месцы жыхарства індывідуальнага прадпрымальніка), а ў выпадках, устаноўленых тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, — найменне і месца знаходжання ўпаўнаважанай вытворцам асобы, звесткі аб юрыдычнай асобе, індывідуальным прадпрымальніку (назва і месца знаходжання юрыдычнай асобы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) і адрас рэгістрацыі па месцы жыхарства індывідуальнага прадпрымальніка), якія ажыццяўляюць увоз у Рэспубліку Беларусь, рэалізацыю і выкарыстанне харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў і якія нясуць адказнасць за адпаведнасць гэтых харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў устаноўленым патрабаванням да іх якасці і бяспекі, вытворчасці і (або) абароту;

— звесткі аб юрыдычнай асобе, індывідуальным прадпрымальніку (назва і месца знаходжання юрыдычнай асобы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) і адрас рэгістрацыі па месцы жыхарства індывідуальнага прадпрымальніка), якія ажыццяўляюць упакоўванне харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў не ў месцы іх вытворчасці для наступнай рэалізацыі або па заказе іншай юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка (за выключэннем выпадкаў упакавання ў спажывецкую ўпакоўку суб'ектамі гандлю, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль);

— звесткі аб складзе і харчовай каштоўнасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, а для біялагічна актыўных дабавак да ежы і спецыялізаваных харчовых прадуктаў для харчавання спартсменаў таксама звесткі аб колькаснай наяўнасці біялагічна актыўных рэчываў (у грамах, міліграмах, мілілітрах, працэнтнай колькасці), харчовай каштоўнасці (энергетычная каштоўнасць, колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, вітамінаў, мінеральных рэчываў) з указаннем працэнта ад рэкамендаванага ўзроўню сутачнага спажывання або нормаў фізіялагічных патрэбаў чалавека;

— рэкамендацыі і (або) абмежаванні па выкарыстанні (прыгатаванні) харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у выпадку, калі іх выкарыстанне (прыгатаванне) без гэтых рэкамендацый і (або) абмежаванняў абцяжарана або можа нанесці шкоду жыццю і здароўю чалавека, яго маёмасці, прывесці да зніжэння або страты смакавых уласцівасцей;

— указанне на тое, што біялагічна актыўная дабаўка да ежы не з'яўляецца лекавым сродкам;

— указанне на тое, што харчовая сыравіна і харчовыя прадукты атрыманы з ужываннем генна-інжынерных арганізмаў;

— колькасць, дату вырабу і тэрмін прыдатнасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў (для біялагічна актыўных дабавак да ежы і спецыялізаваных харчовых прадуктаў для харчавання спартсменаў дадаткова павінны быць указаны форма выпуску і нумар партыі (серыі));

— умовы захоўвання харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, якія ўстаноўлены вытворцам або прадугледжаны тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама ўмовы захоўвання харчовых прадуктаў пасля адкрыцця ўпакоўкі, якая ахоўвала іх ад псавання, якасць і бяспека якіх змяняюцца пасля адкрыцця гэтай упакоўкі;

— адзіны знак абарачэння прадукцыі на рынку дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў выпадках, устаноўленых тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— іншыя звесткі, у тым ліку папераджальныя, устаноўленыя актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

Інфармацыя аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў можа змяшчаць дадатковыя звесткі, у тым ліку звесткі аб дакуменце, у адпаведнасці з якім выраблены харчовая сыравіна і харчовыя прадукты, прыдуманая (арыгінальная) назва харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, таварны знак, звесткі аб уладальніку выключнага права на таварны знак, найменне месца паходжання харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, найменне і месца знаходжання ліцэнзіяра, знакі сістэм дабравольнай сертыфікацыі.

Указанне звестак пра адмысловыя ўласцівасці (спецыяльныя пажыўныя ўласцівасці, паказанні, супрацьпаказанні да прымянення асобнымі ўзроставымі групамі насельніцтва, а таксама пры асобных відах захворванняў) харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, у тым ліку біялагічна актыўных дабавак да ежы, заяўленых уласцівасцях спецыялізаваных харчовых прадуктаў у суправаджальных дакументах, на ўпакоўцы, этыкетках ажыццяўляецца пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя ўласцівасці.

**Артыкул 9. Кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў ажыццяўляюць упаўнаважаныя на тое заканадаўчымі актамі дзяржаўныя органы (іх структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы, тэрытарыяльныя органы, падпарадкаваныя арганізацыі) (далей — дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў) у адпаведнасці з заканадаўствам аб кантрольнай (наглядной) дзейнасці.

**Артыкул 10. Правы юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых вырабаў**

Юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, маюць права:

— уносіць у дзяржаўныя органы прапановы аб удасканаленні заканадаўства ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— абскарджваць рашэнні па актах праверкі дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, патрабаванні (прадпісанні) аб ліквідацыі парушэнняў, дзеянні (бяздзейнасць) іх службовых асоб;

— ажыццяўляць іншыя правы ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства, тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Артыкул 11. Абавязкі юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, абавязаны:

*(Заканчэнне на стар. 7)*

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЯКАСЦІ І БЯСПЕЦЫ ХАРЧОВАЙ СЫРАВІНЫ І ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ ЧАЛАВЕКА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— праводзіць вытворчы, у тым ліку лабараторны ці іншы, кантроль якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, умоў іх вытворчасці, перапрацоўкі (апрацоўкі), рэалізацыі, захоўвання, транспартавання з улікам вызначэння крытычных кантрольных кропак;

— забяспечваць кантроль выканання этапаў тэхналагічнага працэсу стварэння харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў;

— ствараць умовы, якія забяспечваюць якасць і бяспеку харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў пры іх вытворчасці і (або) абароце, у тым ліку забяспечваць захоўванне і транспартаванне харчовай сыравіны для вытворчасці харчовых прадуктаў і харчовых прадуктаў, прызначаных для рэалізацыі ва ўмовах, якія забяспечваюць захаванне іх якасці і бяспекі, у спецыяльна прызначаных або абсталяваных для гэтых мэт памяшканнях і транспартных сродках, якія адпавядаюць устаноўленым патрабаванням;

— упакоўваць харчовую сыравіну і харчовыя прадукты ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншых міжнародна-прававых актаў, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, з прымяненнем спосабаў, якія забяспечваюць захаванне якасці і бяспекі пры іх вытворчасці і (або) абароце;

— прадстаўляць насельніцтву і дзяржаўным органам, якія ажыццяўляюць кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, дакладную інфармацыю аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, якая адпавядае патрабаванням да зместу і спосабаў прадстаўлення такой інфармацыі, устаноўленым гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— прыпыняць вытворчасць і (або) абарот харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў пры выяўленні неадпаведнасці ўстаноўленым патрабаванням да якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, а ў выпадку немагчымасці ліквідацыі выяўленай неадпаведнасці здымаць з вытворчасці і (або) адбіраць з абароту такія харчовую сыравіну і харчовыя прадукты;

— інфармаваць насельніцтва і дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць кантроль (нагляд) у галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, аб неадпаведнасці харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў устаноўленым патрабаванням да іх якасці і бяспекі;

— ажыццяўляць кантроль за ўмовамі працы асоб, якія ў працэсе вытворчасці і (або) абароту харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў ажыццяўляюць непасрэдны кантакт з харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі, а таксама за праходжаннем імі медыцынскіх аглядаў, захаваннем агульных і спецыфічных санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў, гігіенічных нарматываў;

— мець дакумент, які пацвярджае адпаведнасць устаноўленым патрабаванням да якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, у выпадках, устаноўленых актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— забяспечваць нагляд за харчовай сыравінай і харчовымі прадуктамі на стадыях іх вытворчасці і (або) абароту;

— не дапускаць у вытворчасць і (або) абарот харчовую сыравіну і харчовыя прадукты, якія не адпавядаюць устаноўленым патрабаванням да іх бяспекі, патрабаванням да якасці, якія задэклараваныя вытворцам, а таксама фальсіфікаваныя харчовую сыравіну і харчовыя прадукты;

— выконваць патрабаванні да працэсаў утылізацыі і знішчэння харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, устаноўленыя актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза;

— выконваць іншыя абавязкі ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў у адпаведнасці з актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Артыкул 12. Адказнасць за парушэнне заканадаўства ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў**

Асобы, вінаватыя ў парушэнні заканадаўства ў галіне забеспячэння якасці і бяспекі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўчымі актамі».

**Артыкул 2.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

— забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

— прыняць іншыя меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 3.** Гэты Закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

— артыкул 1 — праз шэсць месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

— іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*17 ліпеня 2018 года.*
*г. Мінск*
*№ 127-З.*

■ Эканамікс

## ЗНЕШНІ ДОЎГ КРАІНЫ ЗМЕНШЫЎСЯ

**Паводле інфармацыі Міністэрства фінансаў, знешні дзяржаўны доўг краіны паменшыўся з пачатку года на 288,2 млн долараў (на 1,7 %) і па стане на 1 ліпеня 2018 года склаў 16,4 млрд долараў.**

Пагашэнне знешняга дзярждоўгу з пачатку года склала $1 млрд 423,2 млн, з якіх $800 млн — еўрааблігацыі, $213,4 млн — банкам КНР, $199,6 млн — ураду Расіі, $176,6 млн — ЕФСР, $32,5 млн — МБРР , $0,7 млн — ЗША, $0,4 млн — Еўрапейскаму банку рэканструкцыі і развіцця і Паўночнаму інвестыцыйнаму банку.

У студзені — чэрвені прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму $1 млрд 226,7 млн, у тым ліку $600 млн — еўрааблігацыі, $457 млн — урада і банкаў Расіі, $93,8 млн — банкаў КНР, $73,3 млн — МБРР, 2,6 млн — Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Паўночнага інвестыцыйнага банка.

Дзяржаўны доўг (сума прамых непагашаных пазык цэнтральных органаў улады) краіны на 1 ліпеня склаў BYN42 млрд і зменшыўся ў параўнанні з пачаткам года на BYN207,2 млн, або на 0,5 %.

Унутраны дзяржаўны доўг па стане на 1 ліпеня склаў BYN9,3 млрд, павялічыўшыся з пачатку года на BYN80,2 млн (з улікам курсавых розніц), або на 0,9 %.

За студзень — чэрвень размешчана ўнутраных валютных дзяржаблігацый для юрыдычных і фізічных асоб на суму $255,5 млн. Пагашана валютных і рублёвых дзяржаўных абліргацый для юрыдычных і фізічных асоб на суму $190,6 млн і BYN23,1 млн.

Нагадаем, што золатавалютныя рэзервы краіны на 1 ліпеня сталі менш за месяц на 108,2 мільёна долараў (на 1,6 %) і склалі 6831,4 мільёна долараў. Дынаміка зніжэння працягвалася і ў маі, тады ЗВР зменшыліся на 98,5 мільёна долараў (на 1,4 %). Зніжэнне аб'ёмаў рэзервовых актываў у Нацыянальным банку тлумачаць планавымі пагашэннямі знешняй і ўнутранай запазычанасці. Усяго на выплату даўгоў накіравалі 424 мільёны долараў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## ВАЛЮТНАЯ ВЫРУЧКА ЗАСТАЕЦЦА Ў ЭКСПАРЦЁРАЎ

**Указ аб адмене абавязковага продажу замежнай валюты прыняты на фоне стабілізацыі фінансавай сістэмы і валютнай сітуацыі ў Беларусі. Гэта адзначыў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» фінансавы аналітык Аляксандр САБОДЗІН, каментуючы дакумент, паведамляе БелТА.**



Стабільнасць беларускага рубля, рэкордна нізкая інфляцыя даюць падставы для аптымістычных прагнозаў экспертаў, якія тлумачаць, што для новага дакумента яшчэ раней было падрыхтавана адпаведнае асяроддзе. «Сур'ёзнага ўплыву прынятая мера на валютны рынак не акажа. Больш таго, каб рэалізаваць гэтую праграму, былі створаны станоўчыя перадумовы. Мы бачым, што ў нас фінансавая сістэма стабільная, попыт і прапанова замежнай валюты збалансаваны», — адзначыў Аляксандр Сабодзін.

Пры гэтым на павышэнне дзелавой актыўнасці, на яго думку, з прыняццем указа можна разлічваць. «Фінансавая сістэма стала больш стабільнай, як і валютная сітуацыя. Гэта вельмі пазітыўны сігнал замежным і ўнутраным інвестарам», — адзначыў і **загадчык кафедры БНТУ доктар эканамічных навук Сяргей САЛАДОЎНІКАЎ.** Нацбанк таксама адзначае перавышэнне прапановы валюты над попытам, гэта адбываецца на ўсіх сегментах валютнага рынку. «Ні на біржы, ні на пазабіржавым рынку гэта да нейкіх наступстваў не прывядзе», — рэзюмаваў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей КАЛЕЧЫЦ.** Як паведамлялася, абавязковы продаж часткі валютнай выручкі адменены для лібералізацыі валютных адносін і стымулявання дзелавой актыўнасці.

Гэты інструмент прымяняўся ў перыяд станаўлення беларускага рынку і садзейнічаў фарміраванню прапановы замежнай валюты на валютнай біржы, разам з тым ён з'яўляўся стрымліваючым фактарам, паколькі ўспрымаўся інвестарамі як прыкмета адміністрацыйнага рэгулявання і абмежаванняў. Адмена абавязковага продажу часткі валютнай выручкі суб'ектамі гаспадарання будзе садзейнічаць павышэнню канкурэнтаздольнасці беларускіх экспарцёраў, стане істотным фактарам паляпшэння ўмоў вядзення бізнесу ў Беларусі.

## СТВОРАНЫ ПЕРШЫ ВІРТУАЛЬНЫ ТЭХПАШПАРТ



**Першым аб'ектам нерухомай маёмасці, на які Нацыянальным кадастравым агенцтвам Дзяржкаммаёмасці была цалкам складзена тэхнічная дакументацыя ў электронным выглядзе, стала збудаванне «Лінія электраперадачы ВЛ 330 кВ № 2 АЭС — Паставы» працягласцю 41 847 метраў.**

Дакументацыя — тэхнічны пашпарт на капітальную пабудову ў выглядзе электроннага дакумента і першая электронная інвентарная справа — складзена спецыялістам па тэхнічнай інвентарызацыі і праверана ўпаўнаважанымі службовымі асобамі.

Тэхнічны пашпарт быў падпісаны электронным лічбавым подпісам упаўнаважанай службовай асобы. Дакументы, сфарміраваныя такім чынам, будуць захоўвацца ў архіўнай адкрытай інфармацыйнай сістэме, паведамілі ў прэс-службе Дзяржкаммаёмасці.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# ТАЯМНІЦЫ МІЖРЭЧЧА

## НАШЧАДКІ МІФІЧНАГА ЧАВУСА

По легендзе горад атрымаў сваё імя ад пасла крымскага хана мірзы Чавуса, які нібыта спыняўся ў мястэчку. Так гэта ці не, праверыць цяжка. Але паразважаць можна. І лепей з музейнымі работнікамі. Прыгожы будынак раённага гісторыка-краязнаўчага музея з чырвонай цэглы нельга пераблытаць ні з чым іншым. Старадаўніх пабудоў у Чавусах наогул адзінкі. Дом быў узведзены ў 1902 годзе для мясцовага казначэйства.

— Слова «чавус» — цюркскага паходжання, у татарскім войску чавусамі называлі самы нізкі ваенны чын накшталт нашага яфрэйтара, — расказвае **дырэктар музея Іна КАЗАКОВА.**

Адзін час былі размовы пра тое, каб устанавіць у горадзе сімвал — малую архітэктурную форму ў выглядзе казака. Задумка так і не ўвасобілася ў жыццё, але тэма пастаянна мусіруецца. Юрый Жыгамонт, калі прыязджаў у Чавусы здымаць сваё «Падарожжы дылетанта», дзесьці ў інтэрнэце знайшоў інфармацыю пра тое, што Чавусы былі сталіцай беларускага казацтва. Гэта дастаткова спрэчнае сцвярджэнне, але праграма была знятая і навіна пайшла ў народ.

Цікава, што ў Чавусах сапраўды жыве шмат людзей з сугучным прозвішчам і ўскосна маючым адносіны да яго — Казакевічы, Шараваравы, Харунжыя, Доўбышы... А на фасадзе музея размешчаны дзве інфармацыйныя таблічкі, адна з якіх сведчыць, што ў перыяд ВКЛ гораду было даравана магдэбургскае права. А другая расказвае пра тое, што ў Чавусах падчас вайны Масковіі з Рэччу Паспалітай быў створаны казацкі полк. У музеі пра гэтыя гістарычныя змены нагадваюць два гербы — часоў ВКЛ і расійскай эпохі.

## РАДЗІМА СЛАВУТАГА РАЗВЕДЧЫКА

Хто такі Леў Маневіч, прадстаўляць не трэба. Гэта славуты савецкі разведчык, адзін з шасці Герояў Савецкага Саюза, якіх дала чавуская зямля. Падчас вайны трапіў у палон і памёр у аўстрыйскім канцлагеры. Пахаваны на воінскіх могілках у горадзе Лінцы. Але дзяцінства яго прайшло менавіта ў Чавусах, у так званым Зарэччы. На жаль, хата, дзе ён нарадзіўся, не захавалася. А сённяшнія жыхары гэтага маляўнічага куточка Чавус нічога не змаглі прыгадаць пра знакамітага земляка.

Але макет дома Маневіча можна ўбачыць у Магілёўскай абласной спартыўнай школе ў Чавусах. Ён быў зроблены адным з выхаванцаў школы-інтэрната, які існаваў тут з адкрыцця спартыўнай школы. Імя аўтара, на жаль, не захавалася.

У раённым музеі ёсць бюст і шмат фота блізкіх Маневіча — жонкі Надзеі Дзмітрыеўны і дачкі Таццяны. Апошняя жыла у Маскве і доўгі час падтрымлівала сувязь з Чавусамі. Потым перапіска абарвалася. Нашчадкаў у Таццяны не было.

Шмат гадоў таму прыязджала дэлегацыя з Аўстрыі і перадала музею фотаздымкі з пахавання Маневіча.


Бюст Льва Маневіча ў музеі.


Макет дома знакамітага разведчыка.

## СТАРАДАЎНЯЕ КАПІШЧА

Тутэйшыя мясціны аблюбавалі яшчэ нашы продкі, радзімічы. На чавускай зямлі хапае мясцін, звязаных з іх знаходжаннем. І адно з іх — Радамля, сакральнае месца старажытнага племені. Аграгарадок знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад горада. Але, калі загадзя не даведацца расклад руху аўтобусаў да гэтага населенага пункта, туды будзе складана трапіць. Напрыклад, у пятніцу аўтобус адпраўвіцца па гэтым маршруце толькі ў 19.30. А вось у аўторак і чацвер ёсць рэйсы на 7.40 і 13.55. Трэба ведаць, што аўтобус толькі праязджае цераз Радамлю, канчатковы яго прыпынак — вёска Заложжа. Так што не праспіце.

Радамля цікавая сваім музеем пад адкрытым небам. Пры археалагічных раскопках тут была знойдзена старадаўняя печка. Непадалёк ад яе пабудаваныя паўзямлянкі, дзе можна пабачыць палаці, якімі карысталіся нашы продкі. Летась тут з'явіліся ідалы паганскіх багоў — Вялеса, Мокашы, Дажбога, Перуна і іншых. Пляцоўка ажывае падчас свята «У госці да радзімічаў».

— Адзін наш зямляк успамінаў: калі хацелі знесці сакральны ўзгорак і падагналі тэхніку, відавочцы ўбачылі вогненнае кола, якое акружыла яго. Трактарысты развярнуліся і паехалі назад. Існуе павер'е, што там жывуць душы памерлых, — расказала загадкавую гісторыю пра Радамлю **навуковы супрацоўнік музея Ала СЦЯПАНАВА.**

## І АБРАЗЫ ГРЭЮЦЬ

На жаль, у саміх Чавусах не захавалася ніводнай старадаўняй царквы. Але храм Ушэсця, які адкрыўся шэсць гадоў таму, таксама цікавы. Падчас майго візіту мне пашчасціла сустрэцца з яго настаяцелем, айцом Мікалаем. Ён расказаў цудоўную велікодную гісторыю. Здарылася яна з адной прыхаджанкай, якая прыйшла на святочную ўсяночную з унучкай. У храме было халаднавата, і дзяўчынка стала прасіць бабулю пайсці хутчэй дадому. Скардзілася, што ёй холадна. Бабуля параіла падысці да іконы з Божай Маці і папрасіць сагрэць. Унучка пасля гэтага яе не турбавала. Калі служба скончылася, бабуля падбадзёрыла ўнучку, маўляў, зараз пойдзем дадому — сагрэешся. А тая сказала, што ёй зусім не холадна. Маўляў, яна падышла да іконы і ад сэрца папрасіла Маці Божую сагрэць яе. І тут ёй падалося, што дзіця на іконе працягнула да яе руку і адразу ж стала вельмі цёпла. Ікона, дарэчы, старадаўняя. Яна была канфіскавана мытнікамі падчас спробы вывезці яе за мяжу.

Айцец Мікалай расказаў гісторыю яшчэ адной іконы з выявай святой Фаціны. Яе храму падарыла жанчына, у якой у аўтакатастрофе загінула адзіная дачка. І калі прыходзіць у храм, яна моліцца каля гэтага абраза.


Такім калісьці быў горад.

Дарэчы, у музеі ёсць незвычайная двухбаковая ікона з чавускай Георгіеўскай царквы, якая, на жаль, не захавалася. З аднага боку на нас сумна глядзіць Божая Маці Пачаеўская, на другім знаходзіцца выява Георгія Пераможцы. Прынёс ікону жыхар горада. Яго бабуля, калі закрылі царкву, узяла абраз на захаванне, ён так і ляжаў у яе на гарышчы, загорнуты ў тканіну.

## ПА СЛЯДАХ МАЙКЛА ДУГЛАСА І АРЫЭЛЯ ШАРОНА

На знакамітых землякоў Чавусам пашчасціла. Дастаткова згадаць вядомага беларускага этнографа Івана Насовіча, які склаў слоўнік з больш чым 80 тысяч беларускіх слоў. Родам ён з вёскі Гразівец Чавускага раёна. Варвара Кашаварава-Руднева, першая жанчына-ўрач у царскай Расіі з вышэйшай адукацыяй, таксама ўраджэнка Чавус. Стаць у канцы XIX стагоддзя ўрачом, калі жанчын не дапускалі да вядзення медыцынскай практыкі, гэта вялікі подзвіг. А пра звенняўю па ўборцы льну Ульяну Іванаўну нават песня ёсць: «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...».

У Магілёве калісьці жыў стрыечны брат Майкла Дугласа Міхаіл Даніловіч. Ён расказваў, што ў Чавусах знаходзіўся фамільны склеп іх сямейства. А вось могілкі продкаў былога прэм'ер-міністра Ізраіля Арыэля Шарона — у вёсцы Галавенчыцы. Яго маці ў 12-гадовым узросце выехала адтуль з роднымі спачатку ў Азербайджан, а потым у Палесціну. Там пасля і нарадзіўся Арыэль. У 90-я ён збіраўся прыехаць на радзіму продкаў. «Нас тады яшчэ наведалі супрацоўнікі ізраільскага пасольства, — успамінае Іна Казакова. — Хадзілі па музеі, ездзілі ў Галавенчыцы. На той момант там жыла жанчына, якая помніла дзеда Арыэля — Берку. Ён у мясцовых жыхароў быў паважаны чалавек, меў сваю манапольку, займаўся гандлем. Яго дом стаяў на ўзгорку над возерам. Але ў Шарона раптоўна здарыўся інсульт, і ён не прыехаў. Але засталіся яго ўспаміны, дзе ён называе Чавусы радзімай яго продкаў».

## ЛОЖАК ДЛЯ ТУРЫСТА

Карысныя падказкі, дзе прыпыніцца і што паглядзець, можна знайсці на сайце Чавускага райвыканкама. А заадно пабачыць, як выглядае тутэйшая гасцініца. Тут жа прапануюць забраніраваць нумар. Люкс абыдзецца ў 52 рублі 80 капеек за суткі. Размова ідзе пра двухпакаёўку з поўным наборам мэблі, уключаючы шафу-сценку, тэлевізар, халадзільнік і нават кухню. Санвузел абсталяваны душавой кабінай. За нумар першай катэгорыі, ён крыху прасцейшы — няма сценкі, трэба заплаціць 46,06 рубля. Крыху больш, чым 41 рубель, папросяць за аднапакаёвы нумар на два чалавекі. Для пастаяльцаў дарагіх нумароў прадугледжаны яшчэ і сняданак. Танней застаецца толькі варыянт нешта накшталт хостэла. За ложак у нумары на два, тры і чатыры чалавекі возьмуць 19,5 рубля. Усе выгоды на калідоры, у тым ліку халадзільнік і тэлевізар. І сняданак за свой кошт.

Цяпер пра плюсы гасцініцы. Яна новая і дастаткова рэспектабельная. Разлічана ў тым ліку і на іншаземных гасцей. Сярод рэкламных праспектаў на рэгістрацыйнай стойцы ляжыць буклет і на кітайскай мове.


Музей — адзін з нешматлікіх гістарычных будынкаў у Чавусах.

На сайце райвыканкама можна знайсці спасылкі і на дзве тутэйшыя аграсядзібы, гаспадары якіх дапамогуць арганізаваць вольны час. Прыемна, што ў горадзе дастаткова кавярняў, дзе можна смачна падсілкавацца. Напрыклад, у адной з іх я пакаштавала экзатычны грыбны суп з вушкамі. Каштаваў ён 89 капеек і быў на рэдкасць смачны. Што датычыцца цікавых сувеніраў, то іх шмат у музейнай краме. Асаблівым попытам тут карыстаецца... той самы казак. Што ні кажы, а сімпатыя да казацтва тут адчуваецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Наталля ЛЯХАВЕЦ:

# «ХОЧАЦЦА ФАЙНУЮ СУКЕНКУ? ДАВЕРЦЕСЯ ШВАЧЦЫ!»

**Яе строй надзявала расійская спявачка Паліна Гагарына. За чатыры гадзіны яна сшыла сукенку для Анфісы Чэхавай, якая той не толькі падышла, але і дужа спадабалася. Нават Аляксандр Саладуха звяртаецца да краўчыхі і дызайнера Наталлі Ляхавец, каб тая падшыла яму кашулі. Простая дзяўчына з беларускай вёскі, якая вучылася шыць на швейнай машынцы суседкі, нават не магла ўявіць, што ў яе не будзе адбою ад заказаў не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Зараз яе можна пазнаць па складаных, неадназначных мадэлях адзення, нечаканых дызайнерскіх рашэннях і ўласным эпатажным вобразе. І калі вырашыце адшукаць найлепшую швачку ў Мінску, то пашукаўік першым выдасць яе імя і прозвішча...**





***— Яшчэ некалькі гадоў таму вы збіраліся зрабіць уласную калекцыю. І ўсё жартавалі, што пакуль яна «ў шафе». Атрымалася за гэты час яе пашыць?***

— У мяне няма сваёй калекцыі таму, што я шмат шыю на заказ і фізічна на яе не хапае часу. Хоць у мінулым годзе былі спробы ўсё ж такі яе зрабіць, і нават пяць адзінак ужо гатовыя. Быў спонсар, пайшло каля тысячы долараў на адну толькі тканіну. А для таго каб узяць удзел у паказе, трэба яшчэ дзве тысячы. Каб дарабіць калекцыю, яшчэ столькі ж... Карацей, гэта досыць дарагое задавальненне.

| 3 | в микрорайоне Энергетиков, 16 | 340100000005007402 | 0,0020 | Для размещения легкотипного торгового павильона | Ограничений в использовании не имеет | 5 | 89,35 | 10,00 | 2 534,24 |
| 4 | по ул. Лепешинского | 340100000002006061 | 0,1762 | Для строительства и обслуживания автомойки | Охранная зона сетей и сооружений канализации, объектов газораспределительной системы | 5 | 8 052,25 | 500,00 | 3 410,44 |
| 5 | пер. Луговой 2-й, (участок № 9) | 340100000008005143 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Водоохранная зона рек и водоемов | 99 | 19 192,05 | 1 000,00 | 1 568,06 |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 5 сентября 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидцальные предпринимпатели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранногогражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 2 августа по 3 сентября 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14**

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Организатор аукциона – Лельчицкий районный исполнительный комитет.

Предмет аукциона – право заключения договора аренды на земельный участок площадью 0,1835 га с кадастровым номером 322880401101000174, расположенный по адресу: Гомельская область, Лельчицкий район, аг. Буйновичи, ул. Советская.

Целевое назначение использования земельного участка – для строительства магазина (земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Срок аренды земельного участка – 25 (двадцать пять) лет.

Начальная цена продажи – 277,82 (двести семьдесят семь рублей восемьдесят две копейки).

Сумма задатка – 27,78 (двадцать семь рублей семьдесят восемь копеек).

Размер шага аукциона составляет 10 % от предыдущей цены, названой аукционистом.

Условия продажи:

внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

заключение победителем аукциона с Лельчицким районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации права на земельный участок;

разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;

освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;

осуществления строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Арендодатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет, контактные телефоны в г. п. Лельчицы: 8 (02356) 5-02-51, 5-08-33.**

**1.** Аукцион состоится 5 сентября 2018 г. в 10.00 в здании Лельчицкого районного исполнительного комитета, каб. 209, по адресу: г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42.

**2.** Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в отдел землеустройства райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона.

К заявлению необходимо приложить:

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия личного паспорта;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

***3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 31 августа 2018 года по адресу: г. п. Лельчицы, ул. Советская, 42. Заключительная регистрация участников – 5 сентября 2018 г. с 9.00 до 9.45.***

***4. Сумма задатка перечисляется на счет № BY89AKBB36414210000353000000, в ЦБУ № 315 г. п. Лельчицы филиала № 300 ГУО ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, БИК AKBBBY21300, УНП 400032854, получатель – Лельчицкий районный исполнительный комитет.***

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гастелловское» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **автомобиля грузового седельного тягача «МАЗ-МАН 543268», 1999 г. в., цвет красный, регистрационный знак, АР 0335-5, номер кузова (рамы) Y3N543268X0000031, инв. № 0002423 и полуприцепа автомобильного бортового тентового «KOEGEL SN24», 2005 г. в., регистрационный знак А 0580 Е-5, цвет серый, номер кузова – (рамы) WK0S0002400044698, инв. № 0002829.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 24 720,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (2 472,00 бел. руб.), перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2018. Аукцион состоится **15.08.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.08.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЖНІВЕНЬ

***2 жніўня, чацвер.*** Дзень неспрыяльны для стрыжкі — вы можаце выпусціць з-пад увагі самае галоўнае, не ўбачыць магчымасцяў, якія прыходзяць і сыходзяць.

***3 жніўня, пятніца.*** Уладальнік прычоскі, зробленай у гэты дзень, на працягу значнага тэрміну будзе выдатна выглядаць, а ў яго асабістым жыцці ўсё будзе складвацца вельмі ўдала.

***4 жніўня, субота.*** Выдатны дзень для стрыжкі: пасля наведвання салона вы будзеце знаходзіцца ў прыўзнятым настроі і лёгка вырашыце праблему, якая не давала спакою апошнія некалькі тыдняў.

***5 жніўня, нядзеля.*** Стрыжка ў гэты дзень спрыяе абвастрэнню прыроднай інтуіцыі. Змена адцення валасоў падвысіць самаацэнку, а таксама надасць упэўненасці, каб давесці да канца даўно задуманую справу.

***6 жніўня, панядзелак.*** Удалы дзень для поўнай змены іміджу. Стрыжка ў гэты дзень цягне за сабой ачышчэнне арганізма, пазбаўленне ад негатыўных эмоцый.

***7 жніўня, аўторак.*** Сёння можна стрыгчы валасы, каб паскорыць іх рост, палепшыць паток энергіі здароўя і грошай.

***8 жніўня, серада.*** Няўдалы дзень для стрыжкі і іншых маніпуляцый з валасамі.

***9 жніўня, чацвер.*** Стрыгчыся не рэкамендуецца. Гэта можа негатыўна адбіцца на вашым здароўі, асабліва на крывяноснай і эндакрыннай сістэмах.

***10 жніўня, пятніца.*** Стрыжка надасць больш энергіі, жыццёвых сіл. Уплыў на валасы станоўчы: павялічыцца аб'ём, паменшыцца выпадзенне.

***11 жніўня, субота.*** Калі вырашыце зрабіць стрыжку менавіта сёння, майце на ўвазе, што гэта павінен быць крайні выпадак. А даўжыня астрыжаных валасоў — не больш за тры сантыметры.

***12 жніўня, нядзеля.*** Сёння стрыжка не толькі забяспечыць добрую форму, але і будзе станоўча ўплываць на здароўе валасоў.

***13 жніўня, панядзелак.*** Для тых, хто хоча аздараўляць свае валасы, а таксама ў корані зманяць жыццё, варта неадкладна адправіцца да цырульніка.

***14 жніўня, аўторак.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі. Стан валасоў не зменіцца.

***15 жніўня, серада.*** Новая стрыжка станоўча паўплывае на ўзаемаадносіны з роднымі і каханым чалавекам.

***16 жніўня, чацвер.*** Калі ў вас на душы «камень», «скрабуць кошкі» або жудасна мучыць сумленне, то лепш пастрыгчыся менавіта сёння, тады разам з часткай валасоў вы зможаце пазбавіцца ад усяго назапашанага ўнутры вас негатыву і адчуць сябе абноўленым чалавекам.



***17 жніўня, пятніца.*** Адкладзіце ненадоўга стрыжку і вы збераждаце валасы ад вялікай бяды.

***18 жніўня, субота.*** Агульны стан валасоў не зменіць ніякая працэдура, някай гэта будзе стрыжка ці афарбоўка.

***19 жніўня, нядзеля.*** Не найлепшы момант для стрыжкі: новая прычоска можа стаць прычынай дэпрэсіі або выклікаць пачуццё падвышанай трывожнасці.

***20 жніўня, панядзелак.*** Стрыгчыся непажадана. У плане прыгажосці стрыжка вас хутка расчаруе, а з іх эзатэрычнага пункту гледжання яна яшчэ можа і ўключыць ланцужок няўдач.

***21 жніўня, аўторак.*** Ніадрэнны дзень: ёсць усе шансы, што стрыжка дапаможа ўмацаваць валасы, зрабіць іх больш густымі і здаровымі.

***22 жніўня, серада.*** Нейтральны дзень для стрыжкі валасоў. Затое адрастаць яны будуць хутчэй, чым на ветах.

***23 жніўня, чацвер.*** Выдатны дзень для эксперыментаў з вобразам. Нарэшце можна рашыцца на кароткую стрыжку — вынік перасягне ўсе чаканні.

***24 жніўня, пятніца.*** Усе віды маніпуляцый з валасамі гарантавана паспрыяюць умацаванню аўтарытэту, грамадскага і фінансавага становішча.

***25 жніўня, субота.*** Нейтральны перыяд для стрыжак. Рост валасоў можа значна прыпыніцца.

***26 жніўня, нядзеля.*** Сёння валасы стрыгчы непажадана. Расчэсвайце іх на працягу дня па колькасці поўных гадоў. Гэта дапаможа пазбавіцца ад негатыву і прыцягнуць у жыццё пазітыў.

***27 жніўня, панядзелак.*** Калі няма жадання прыўнесці ў жыццё праблемы асабістага характару, а таксама цяжкасці з работай, лепш перанесці змену іміджу. Нават стрыжка грыўкі можа негатыўна адбіцца на здароўі.

***28 жніўня, аўторак.*** Сёння валасы не варта ні стрыгчы, ні нават мыць.

***29 жніўня, серада.*** Перанясіце стрыжку на іншы дзень. Тыбецкія мудрацы кажуць, што стрыжка ў гэты дзень скарачае жыццё.

***30 жніўня, чацвер.*** Няўдалы дзень для наведвання цырульні: прычоска атрымаецца зусім не такой, як вы сабе ўяўляеце, і можа вас сур'ёзна знерваваць.

***31 жніўня, пятніца.*** Стрыжкі рабіць сёння можна і трэба, бо час для гэтага якраз спрыяльны, валасы стануць больш густыя.

**Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Вишневец-Стрелковая, ул. Неманская-Петра Милонеги-Полевая) 4 сентября 2018 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-48*,** | район улиц Вишневец и Стрелковая | 0,1006 | 440100000001010438 | 2 210,61 | 37 441,80 | 7 500 |
| 2 | Земельный участок У-1*,*** | район улиц Неманской – Петра Милонеги – Полевой | 0,1077 | 440100000002009464 | 3 096,89 | 56 599,74 | 11 000 |

*Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения

**победителю аукциона необходимо возместить убытки, причиняемые землепользователям, в размере 11 993,58 руб.;

***победителю аукциона необходимо возместить убытки, причиняемые землепользователям, в размере 9 928,05 руб.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 4 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 6 августа по 29 августа 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by

## ■ Zамор'е

### Індыец заплаціў 70 кілаграмаў аліментаў

**Жыхарка індыйскага горада Чандзігарх падала ў суд на былога мужа, які заплаціў аліменты манетамі, паведамляе выданне Hindustan Times.**



Заможны адвакат падаў на развод у 2014 годзе. Суд абавязаў яго выплачваць былой жонцы 25 тысяч рупій (каля 740 рублёў) штомесячна. Мужчына праігнараваў рашэнне, і цяжба працягнулася ў наступнай інстанцыі. У рэшце рэшт ён здаўся і прынёс грошы. Былая жонка атрымала чатыры купюры па 100 рупій і 24,6 тысячы — манетамі вартасцю адна і дзве рупіі. Агульная вага дробязі перавысіла 70 кілаграмаў. Жанчына адзначыла, што былы муж наўмысна здзекуецца і мучыць яе. Мужчына ў адказ падкрэсліў, што нічога не парушыў, таму што нідзе не пазначана, як менавіта трэба выплачваць аліменты.

### У Францыі мэр забараніў камароў

**У французскім горадзе Брыале, дэпартамент Мен і Луара, забаранілі камароў, паведамляе выданне The Connexion.**



Мясцовыя жыхары сталі скардзіцца на засілле кровасысучых насякомых пасля паводкі ў ліпені. Мэр Брыале Андрэ Маршан адрэагаваў на гэта ўказам, які забараніў камароў у горадзе. Акрамя таго, ён устанавіў пасткі для камароў каля ратушы, пачатковых школ і дзіцячага садка. «Такім камічным спосабам я спрабаваў данесці да гараджан думку, што ў рэчаіснасці я нічога не магу з гэтым зрабіць, — растлумачыў мэр. — Большасці гэта здалося смешным». Тым не менш пасля ўказа камароў стала менш, аднак, паводле слоў Маршана, гэта ніяк не звязана з забаронай.

### Амерыканец украў «хуткую» з-за спякоты

**Жыхар амерыканскага горада Меса, штат Арызона, украў машыну хуткай дапамогі, таму што не хацеў ісці пешшу ў спякоту, паведамляе Fox 10 Phoenix.**



37-гадовы Тод Шэл выпісаўся са шпіталя, выйшаў на вуліцу і выявіў, што там невыносна горача. Каля будынка стаяла пустая машына хуткай дапамогі, на якой толькі што прывезлі новага пацыента, — медыкі спяшаліся і забыліся дастаць ключ з замка запальвання. Шэл вырашыў скарыстацца гэтым, сеў у машыну і з'ехаў. Неўзабаве паліцыя высачыла згоншчыка па сігнале GPS-маяка, якім быў абсталяваны аўтамабіль. Пасля арышту Шэл растлумачыў, што накіроўваўся дадому па грошы. Ён планаваў перакусіць, а потым вярнуць машыну. Мужчыну выстаўлены абвінавачанні ў незаконным выкарыстанні ТС і ўцёках ад супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

Згон быў здзейснены 24 ліпеня, калі тэмпература паветра ў горадзе дасягнула рэкорднага ўзроўню — 47 градусаў па Цэльсію.

### Чыноўніца тры гады спіць на рабоце

**Супрацоўніца дэпартамента аўтатранспарту амерыканскага штата Каліфорнія пастаянна спала на рабочым месцы, паведамляе выданне The Sacramento Bee.**




Відавочцы расказалі следчым, што яна кожны дзень прыходзіла ў офіс, засынала і не прачыналася па меншай меры тры гадзіны. З лютага 2014 года да снежня 2017-га яна патраціла на адпачынак каля 2,2 тысячы гадзін рабочага часу. Жанчына тлумачыла офісны сон хваробай. У 2016 годзе ўрач, які яе лечыць, паведаміў установе, што яна не здолела выконваць ранейшыя службовыя абавязкі. Супрацоўніцы далі іншую пасаду, але яна працягнула хадзіць на працу і спаць. Яе калегі неаднаразова скардзіліся начальству, аднак рэакцыі так і не было. Жанчына працягвае працаваць у дэпартаменце транспартных сродкаў і па-ранейшаму спіць.

**Іван КУПАРВАС** ■

■ Нефармат

# КАЛІ СУКЕНКА І ПРАСЦІНА СТАНОВЯЦЦА СЦЯГАМІ



**Памятаеце той даўні скандал у Белым доме? Прэзідэнту самай магутнай дзяржавы ў свеце ледзь не каштавала пасады інтрыжка са стажоркай адміністрацыі. Ды хто б даведаўся пра тую мімалётную сувязь альбо хто прыдаў бы ёй значэнне, каб не рэчавы доказ, які разважлівая паненка ўвесь час захоўвала ў халадзільніку? У патрэбным месцы ў патрэбны час сукенка, вынятая з маразілкі, атрымала сілу, можа нават большую, чым сцяг цэлай арміі праціўніка. Так бывае з паненкамі, калі яны пралічваюць некалькі хадоў наперад.**

Нядаўна давялося зноў назіраць патрэсванне бруднай бялізнай... Зусім не аматар я гэтых рэйтынгавых перадач з выцягваннем на свет падрабязнасцяў асабістага жыцця, не гляджу іх амаль ніколі. На гэты раз у час пераключэння пультам каналаў вока зачапілася за Карачанцава, артыста, якога я заўсёды паважала за талент, за інтэлігентнасць, за адсутнасць яўнай «зорнай» хваробы. Заўсёды адчуваю нейкую няёмкасць, калі яго, нямоглага, чарговы раз цягнуць у эфір. А тут яшчэ ў такім кантэксце!

Хто не ў курсе, у двух словах растлумачу. Былая балерына Марыінскага тэатра Алена Дзмітрыева ў нейкім часопісе расказала пра свой нібыта 23-гадовы раман з Карачанцавым. Паводле яе слоў, адносіны цягнуліся з пераменным поспехам, за гэты час яна выходзіла замуж, разводзілася, нарадзіла дачку, але Мікалай перыядычна ўзнікаў у яе жыцці зноў. Так было да самай аварыі 2005 года, пасля якой артыст стаў інвалідам. Усе гэтыя гады яго дагледае жонка Людміла Поргіна. Людміла Андрэеўна перыядычна вывозіць Мікалая Пятровіча на інваліднай калясцы ў эфір розных перадач.

Але ж вернемся да нашай балерыны. Акрамя фотаздымкаў яна дэманстравала «доказы» — запіс яго голасу на аўтаадказчык, які захоўвала 17 гадоў, паказвала прасціну, на якой спалі разам з каханкам, бялізна таксама захоўваецца ў шафе. Захоўваць рэчы як рэліквію, як памяць аб каханні, можа, і нармальна, а вось даставаць і дэманстраваць публічна — гэта ўжо сіндром Монікі. Узнікае галоўнае пытанне: навошта?! Некаторыя, у тым ліку былыя калегі Дзмітрыевай, выказаліся ў інтэрнэце, што балерына, якая старэе, захацела порцыю славы і грошай. Магчыма. Яна ж божыцца, што жыве ды працуе ў Парыжы і ёй усяго хапае. Тады сапраўды: дзеля чаго? Каб прычыніць боль яго жонцы, блізкім, яму самому, нагадаць пра сябе? Некалі адна з маіх настаўніц казала: «Калі гэтае імя вам дарагое, насіце яго ў сэрцы, а не выдзірайце на парце!» Ну і праўда, калі дапусціць, што адносіны і сустрэчы мелі месца, то самы час іх схаваць ад свету ў далёкім куточку душы. Тым больш зараз, калі герой таго даўняга рамана адказаць па сутнасці не можа. Яго наогул даўно не было б на свеце, каб пасля страшнай аварыі не трапіў адразу ў інстытут Скліфасоўскага, каб клапатлівая жонка не вазіла па дактарах і клініках, не забяспечвала б штодзённую рэабілітацыю. Ды і наогул чалавеку, для якога дасягненнем выглядае самастойна паесці, папіць, схадзіць у туалет, многія іншыя рэчы бачацца ўжо зусім неістотнымі. Так і хочацца крыкнуць ім усім: «Пакіньце ў спакоі, не лезьце ў душу».

Не вельмі разумею я і жонку артыста пры ўсёй пашане за яе місію, бо няма нічога цяжэйшага, чым даглядаць гадамі хворага чалавека. Навошта яна наогул дала згоду на гэтую перадачу? Яна тлумачыла, што прыйшла абараніць гонар сваёй сям'і, расказвала, што яны з Мікалаем маюць медалі Пятра і Фяўронні, якія ім уручыў Патрыярх. Усё гэта добра. Але ж тое інтэрв'ю не вельмі чалавечнай балерыны прачыталі хай сабе сотні людзей, хай тысячы. А вось гэтыя прасціны ды іншыя дэталі сталі ўжо набыткам мільёнаў тых, хто ведаў і любіў Карачанцава як бліскучага акцёра кіно. Калі ж балерына трэсла цёмнай прасцінай на кадрах папярэдніх здымкаў, а жонка ў эфіры ў адказ крычала, што яна любіць светлую пасцельную бялізну... было не толькі страшна няёмка, было вельмі сорамна за ўвесь жаночы род. І яшчэ. Я чамусьці ўпэўнена, што калі б Мікалай Пятровіч быў здаровы і дужы, як раней, а нейкая жанчына Х страціла здароўе, напрыклад, праз аварыю, то ён не дапусціў бы, каб нават адбітак ценю любых плётак ці чутак упаў на мінулае той жанчыны, парушыў яе спакой. А інакш я ні халеры не кемлю ў людзях.

**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.25 | 21.06 | 15.41 |
| Віцебск — | 5.09 | 21.01 | 15.52 |
| Магілёў — | 5.15 | 20.56 | 15.41 |
| Гомель — | 5.18 | 20.46 | 15.28 |
| Гродна — | 5.41 | 21.20 | 15.39 |
| Брэст — | 5.48 | 21.14 | 15.26 |

**Месяц**

*Поўня 27 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

***Пр.** Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*
***К.** Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

ВАРШАВА +26..+28°C
ВІЛЬНЮС +25..+27°C
КІЕЎ +26..+28°C
МАСКВА +27..+29°C
РЫГА +26..+28°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +26..+28°C

**Даты | Падзеі | Людзі**

**2 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1333** год — завершана будаўніцтва Лідскага замка, помніка беларускага абарончага дойлідства. Уваходзіў у лінію абароны супраць крыжакоў Наваградак — Крэва — Меднікі — Трокі. Замак пастаўлены на насыпным пясчаным узгорку, быў акружаны балоцістымі берагамі рэк Лідзея і Каменка, з поўдня — ровам, які злучае гэтыя рэкі і аддзяляе замак ад горада. Пазней у сістэму перадзамкавых умацаванняў з усходу ўключана штучнае возера. Асноўнае абарончае значэнне мелі сцены, пастаўленыя на невысокі падмурак, у верхняй частцы знаходзілася баявая галерэя з байніцамі. Замак неаднаразова быў у аблозе, разбураўся. У 1920-х гадах зроблена частковая, у 1982-м — поўная яго кансервацыя. З 2006 года вядзецца рэстаўрацыя сцен і вежаў.

**1810** год — нарадзіўся (Магілёўская губерня) Дзмітрый Пятровіч Жураўскі, расійскі эканаміст, статыстык. З 1831 года працаваў у камісіі М. Сперанскага па складанні збору законаў Расійскай Імперыі. Стварыў сістэму статыстычных паказальнікаў і метадаў вывучэння з'яў грамадства і прыроды, склаў праграму вывучэння вытворчых сіл Расіі. У пытаннях палітэканоміі набліжаўся да разумення тэорыі працоўнай і прыбавачнай вартасці. Прычыну ўсіх бедстваў народа бачыў у існуючых вытворчых адносінах, у размеркаванні прыватнай уласнасці па класах, адкуль вынікала, што галоўным тормазам развіцця прадукцыйных сіл Расіі з'яўляецца прыгоннае права. Асноўнае прызначэнне ўсёй эканамічнай навукі бачыў у забеспячэнні росту народнага дабрабыту. Прагрэсіўныя палітэканамічныя ідэі Жураўскага аказалі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё эканамічнай навукі ў Расіі. Памёр у 1856 годзе.

**1840** год — выйшаў указ расійскага імператара Мікалая I аб спыненні дзейнасці на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года.

**1923** год — нарадзіўся (в. Вішнева, Валожынскі павет, Навагрудскае ваяводства) Шымон Перэс, палітычны і дзяржаўны дзеяч Ізраіля, Нобелеўскі лаўрэат міру (1994 год), чыя палітычная кар'ера доўжылася больш за 70 гадоў. Дзявяты прэзідэнт Дзяржавы Ізраіль з ліпеня 2007 па ліпень 2014 года. Шматгадовы дэпутат кнесета (абіраўся бесперапынна з 1959 па 2007 гады). Дзявяты і дванаццаты прэм'ер-міністр Ізраіля (1984—1986 і 1995—1996), хоць партыя пад яго кіраўніцтвам ні разу не перамагала на выбарах. Аўтар 11 кніг і вялікай колькасці публікацый і палітычных артыкулаў, якія расказваюць пра гісторыю араба-ізраільскага канфлікту.



У свеце

**1858** год — рашэннем брытанскага ўрада была ліквідавана Англійская Ост-Індская кампанія — акцыянернае таварыства, створанае ў 1600 годзе, якое мела шырокія прывілеі для гандлёвых аперацый у Індыі.

**1918** год — СНК Савецкай Расіі прыняў дэкрэт аб правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы РСФСР, у адпаведнасці з якім адмянялася спагнанне платы за навучанне.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Вось я заўсёды быў у сям'і галоўны!**
**— Ды няўжо?**
**— Уяві сабе! Мне адразу пасля вяселля так жонка загадала.**

Паспрабуйце пахваліць жонку. Гэта нічога, калі з нязвычкі яна спалохаецца.

**— Доктар, чаму замест таго, каб вылечыць мяне, вы жартуеце пра маю бессань?**
**— Гэта весела!**
**— І шмат у вас яшчэ жартаў?**
**— Вам і не снілася!**

На свеце ёсць шмат страшных рэчаў.

Адна з іх — будзільнік у суботу раніцай, які забыўся выключыць у пятніцу.

Дарагую жонку, матулю і бабулю **Святлану Аляксандраўну КУРКАЧ** шчыра віншуем з юбілеем!
Зычым нашай любай здароўя, бадзёрасці, любові і ўсмешак. Няхай твае дні поўняцца сонечным святлом і пяшчотай. Мы цябе вельмі любім, родная наша.

Хочам аднаго прасіць у Бога:
Каб чароўнай песняй быў твой лёс,
Каб гадоў табе пражыць так многа,
Колькі зор на ручніку нябёс!
Колькі цвету ў зялёным гаі,
Столькі шчасця мы табе жадаем,
А як болей будзе трэба,
Хай Гасподзь дарue з неба.



*Муж Андрэй, сын Сяргей, дачка Тацццяна, унукі і праўнучка.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2855.
Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12